Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Новыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: Мінгарадзкія — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капярэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капярэлі насьпрэд тэксту 1 р. — к. За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 273 (2461) Серада, 28-га лістапада 1928 г.

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ ЦК І ЦКК КП(б)Б АДЧЫНЯЕЦЦА СЁНЬНЯ А 6-АЙ ГАДЗІНЕ УВЕЧАРЫ Ў ПАМЯШКАНЬНІ ЦК КП(б)Б.

Першыя вынікі і далейшы пераход на 7-гадз. дзень.

Сямігадзінны рабочы дзень, гэта рашучы крок да пераходу ў далейшым на 6 гадзін працы, намечанага ленінскай партыяй.

Пленум ЦК УсеКП(б) даручае ВСНГ больш шырока пераводзіць зараз на 7-гадзінны дзень прадпрыёмствы цяжкае індустрыі.

Рэзалюцыя па дакладу т. Шмідта, ухваленая адназгодна пленумам ЦК УсеКП(б) 24 лістапада 1928 г.

Маніфест ЦВК СССР, які забясьпечыў для вытворчых і фабрычна-заводзкіх рабочых на працягу бліжэйшых гадоў пераход ад васьмігадзіннага рабочага дню да сямігадзіннага без зьмяншэньня заработку, ёсьць рашучы крок да ажыцьцяўленьня праграмы УсеКП(б) аб увядзеньні, пры агульным павялічэньні прадукцыйнасьці працы, максымальнага тасьцігадзіннага рабочага дню без зьмяншэньня заработку і зьяўляецца вялізнымі дасягненьнем рабочае клясы, якая в посьпехам будзе сацыялізм у краі не дыктатуры.

Апрача найвялікшага прынцыповага значэньня для справы аховы працы рабочае клясы і ўзьнімецца яе культурнага ўзроўню, ажыцьцяўленьне сямігадзіннага рабочага дню на працягу бліжэйшых гадоў уяўляе сабою найвялікшае значасьці эканамічную праблему, якая патрабуе да сябе выключнае ўвагі з боку шырокіх мас рабочае клясы, партыі, прафсаюзаў, гаспадарчых органаў.

Увядзеньне сямігадзіннага рабочага дню лішні раз падкрэсьлівае КАРАННУЮ РОЗЬНІЦУ эканомікі савецкае гаспадаркі і сацыялістычны характар яе рацыяналізацыі, якая накіравана да ўсямернага, няўхільнага паляпшэньня эканамічнага становішча, да культурнага росту рабочае клясы і якая адбываецца побач з непасрэдным паляпшэньнем становішча рабочае клясы, у адзнаку ад капіталістычнае сыстэмы і яе мэтадаў рацыяналізацыі, якая грунтуецца на эксплёатацыі і прыгнечаньні рабочае клясы, на далейшым пагоршэньні яе эканамічнага становішча (павялічэньне рабочага дню, зьніжэньне заработку і г. д.).

ВОПЫТ правядзеньня сямігадзіннага рабочага дню ў тэкстыльнай прамысловасьці, не зважаючы на шмат недахопаў, азначаных у пастановах ЦК ад 20-га мая 1928 г. аб папярэдніх выніках пераводу на сямігадзінны рабочы дзень групы тэкстыльных прадпрыёмстваў, ДАКАЗАЎ, што са зьнішчэньнем іх сямігадзінны рабочы дзень забясьпечыць: паляпшэньне в-творчасьці, уцягваньне новых кадраў рабочых і, тым самым, значнае паляпшэньне беспрацоўя, далейшы рост прадукцыйнасьці працы і заработку і больш шырокі ўздым культурнага ўзроўню рабочае клясы.

Дзеля зьнішчэньня недахопаў, якія выявіліся пры правядзеньні сямігадзіннага рабочага дню ў групе тэкстыльных прадпрыёмстваў і галоўнымі з якіх зьяўляюцца:

а) вольнай слабай ураўнаважанасьці значэньня сямігадзіннага рабочага дню для рабочае клясы, прычым шырокая рабочая маса, як правіла, яе прымалася да прапрацоўкі практычных умоў пераводу на сямігадзінны рабочы дзень;

б) арганізацыйна-тэхнічная непадрыхтаванасьць самых прадпрыёмстваў;

в) нястача добра кваліфікаванае, падрыхтаванае да выкананьня поўнае нагрузкі працы рабочае сілы, недастача вопытнага тэхнічнага персаналу;

г) слабая вытворчая дысцыпліна пакаёмкіх рабочых;

д) непадрыхтаванасьць значнае часткі прадпрыёмстваў у адносінах стварэньня нармальных умоў працы, асьвятленьне, вэнтыляцыя, тэхніка бязьпасьнасьці і іншае;

е) нагоршаньне бытавых умоў, адсутнасьць належнага ліку памяшканьняў, згуртаванасьць у інтэрнатах, непрыстасаванасьць да абслугоўваньня пры далатковай зьмене рабочых з боку розных установ: ясьлі, больніцы, трамваі, каапэрацыйныя крамы і г. д.;

ж) нагоршаньне абслугоўваньня рабочае масы з боку партыйных, прафесіянальных, савецкіх арганізацый—пленум лічыць неабходным:

1) абавязаць парторганы, гаспадарчыя органы і ў першую чаргу прафсаюзы паставіць сваю масавую працу на прадпрыёмствах так, каб уся падрыхтоўчая праца дзеля пераводу прадпрыёмстваў на сямігадзінны рабочы дзень была даведзена да ведама рабочых, каб яна праходзіла пры актыўным удзеле і падтрыманьні рабочых, а таксама ўзмацніць культурна-асьветную працу, прыстасаваўшы яе да новых умоў працы прадпрыёмстваў;

2) прапанаваць ВСНГ, каб ён ужыў усе меры да таго, каб да фактычнага пераходу на сямігадзінны рабочы дзень была праведзена падрыхтоўчая праца, якая павінна забясьпечыць намечанае Прамфінпланам беспераабойнае разгортваньне і якаснае паляпшаньне вытворчасьці (забясьпечаньне сыравінаю, устаноўка дадатковага абсталяваньня, зьніжэньне абсакоту, забясьпечаньне рабочаю сілаю адпаведнае кваліфікацыі і тэхнэрсаставам).

3) таксама гаспадарчыя органы, у веданьні якіх знаходзяцца прадпрыёмствы, намечаныя да пераводу на сямігадзінны рабочы дзень, абавязаць ўжыць усе меры, каб прадпрыёмствы в сямігадзінным рабочым дні былі забясьпечаны своечасным фінансаваньнем капітальных работ;

4) ЦК прапануе НК Працы і Цэнтральнаму Камунальнаму Банку, пры разьмеркаваньні крэдытаў на жыллёвае будаўніцтва, магчыма ў поўным разьмеры здаволіць будаўніцтва рабочых кватэр пры прадпрыёмствах, якія пераводзяцца на сямігадзінны рабочы дзень, асабліва там, дзе ўводзіцца дадатковая зьмена;

5) прапанаваць НК Працы супольна з ВСНГ, каб яны ўжылі ўсе магчымыя меры да аздараўленьня ўмоў працы на прадпрыёмствах, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень, у першую чаргу на прадпрыёмствах, з дадатковаю зьменаю, забясьпечыўшы іх правядзеньне адпаведнымі асыгнаваньнямі з Прамфінплану;

6) прапанаваць НК Працы, ВСНГ і УсеЦСНС правесьці ў жыцьцё пастанову заканадаўчых органаў аб вызваленьні жанчын дажарных і з грудным дзіцьмі ад працы ў начную зьмену на прадпрыёмствах, пераведзеных і намечаных да пераводу на сямігадзінны рабочы дзень. Адначасна абавязаць мясцовыя партыйныя камітэты правесьці шырокую растлумачаючую кампанію сярод работніц на правядзеньне гэтае пастановы;

7) прапанаваць СНК саюзных рэспублік абавязаць Наркамасьветы і НК аховы здароўя ўзмацніць мерапрыёмствы на абслугоўваньні бытавых і культурных патрэб рабочых на прадпрыёмствах, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень (ясьлі, больніцы, школы), забясьпечыўшы правядзеньне гэтых мерапрыёмстваў неабходнымі асыгнаваньнямі.

З пераходам на сямігадзінны рабочы дзень пытаньне аб падрыхтоўцы рабочае сілы набывае асабліва важнае значэньне. Пасьпяховае ажыцьцяўленьне сямігадзіннага рабочага дню зьвязана з увядзеньнем больш высокае тэхнікі, новых матэдаў вытворчасьці, больш высокае арганізацыі працы, а гэта, у сваю чаргу, будзе патрабаваць аб рабочага больш культурных адносін да працы, рашучага зьніжэньня непрадукцыйных прадуўных затрат, больш высокае інтэнсыўнасьці працы і вытворчае дысцыпліны. На падставе гэтага ЦК прапануе ВСНГ, Галоўпрафсаветы і НК Працы, набудаваць сваю працу ў галіне вытворчага навучаньня вучняў і перападрыхтоўкі рабочых такім парадкам, каб яны змаглі ўзвоіць новыя рацыянальныя спосабы працы на падставе навуковых дасягненьняў Цэнтральнага Інстытуту Працы, і навуковых інстытутаў працы.

Надаючы асабліва важнае значэньне падрыхтоўцы рабочае сілы праз школы фабрычна-заводзкага вучнёўства, прапанаваць Галоўпрафсаветы і ВСНГ яшчэ больш прыстасаваць працу школ фабрычна-заводзкага вучнёўства да затрабаваньняў прамысловасьці на кваліфікаваную рабочую сілу, якая ўзадзена б больш удасканаленымі прыёмамі працы.

Побач з гэтым, прапанаваць Наркамасьветы ўзмацніць разьвіцьцё сеткі як школ элементарнае асьветы, так і сямігодак пры прамысловых прадпрыёмствах дзеля ўздыму агульнае асьветы і культуры рабочых.

Пленум ЦК ухваляе ўзяты ЦК тэмп пераводу прамысловасьці і транспарту на сямігадзінны рабочы дзень (к ля 20 проц. у 1928-29 годзе і на меньш 20 проц. у 1929-30 годзе), які забясьпечыць пераход на сямігадзінны рабочы дзень усю прамысловасьць і транспарт у бліжэйшае сямігодзьдзе.

Ухваляючы ў асноўным сьпіс прадпрыёмстваў, намечаны да пераводу на сямігадзінны рабочы дзень, які запьверджан СНК па дакладу ўрадавае комісіі пасьля ўзгадненьня сямігадзіннага рабочага дню, пленум адначасна недастаткова пераводу на сямігадзінны рабочы дзень прадпрыёмстваў цяжкае індустрыі і прапануе ўрадавай камісіі ВСНГ яшчэ раз перагледзець сьпіс прадпрыёмстваў, намечаных да пераводу на сямігадзінны рабочы дзень з пункту гледжаньня необходнасьці ўключэньня найбольш цяжкіх у адносінах аховы працы вытворчасьцяў, а таксама з пункту гледжаньня эканамічных кантэкстаў сьцяў дакага прадпрыёмства, яго прадукцыі ва ўсёй сыстэме вытворчасьці, асабліва ў галіне цяжкае індустрыі і мэтаёмкасьці. Прапанаваць урадавай камісіі ВСНГ абмеркаваць гэтае пытаньне з пункту гледжаньня магчымасьцяў увесьці дадатковыя зьмены на гэтых заводах, з адначасным увядзеньнем сямігадзіннага рабочага дню.

Прапанаваць ВСНГ распрацаваць перспэктыўны пяцігадовы плян пераводу на сямігадзінны рабочы дзень, увязаўшы яго в агульнай пяцігодкай разьвіцьця прамысловасьці, рэканструкцыі асобных галін яе і капітальным будаўніцтвам. Разглядаючы сямігадзінны рабочы дзень, аддаючы яго эканамічнага значэньня, як самую значную прадпасылку для ўзьнімцця культурнага ўзроўню рабочае клясы, пленум ЦК лічыць першаю асноўнаю задачаю партыйных, прафесіянальных, гаспадарчых і савецкіх арганізацый заставіць сваю працу такім парадкам, каб больш час рабочага, у зьвязку з пераходам на сямігадзінны рабочы дзень, выкарыстоўваўся для далейшага росту культурных і эканамічных заваёў рабочае клясы, для ўзацнення ўдзелу рабочых у кіраўніцтве дзяржавою, а гэта ў сваю чаргу будзе мець вялізарнае міжнароднае значэньне ў справе барацьбы рабочае клясы за сваё поўнае вызваленьне.

Пазыка індустрыялізацыі на вёсцы.

„Правда" ў перадавіцы «Заём индустриализации в деревне" піша:

Амаль поўнае разьмяшчэньне 2-е пазыкі індустрыялізацыі, ды яшчэ ў такі кароткі час, бязумоўна, зьяўляецца адным з найлепшых паказьнікаў, што шырокія пралетарскія масы Савецкага Саюзу не на словах, а на справе падыйшлі да задачы шырокага сацыялістычнага будаўніцтва народнае гаспадаркі. Да сучаснага моманту, галоўным парадкам, сярод гарадзкога жыхарства і пераважна рабочых, ужо разьмешчана каля 450 міліёнаў руб., г. зн. каля 90 проц. агульнае сумы.

Рабочая кляса Саюзу сказала сваё слова. Але цалкам не сказала гэтага слова сялянства. Тыя некалькі дзесяткаў міліёнаў руб., якія сабраны на вёсцы, не зьяўляецца хоць колькі-небудзь характэрнымі для ацэнкі адносін сялянства да пазыкі і сьведчаць хутчэй аб нядбайных адносінах апарату да справы вялізнае важнасьці спрыяньня прамысловаму будаўніцтву. Асноўная ідэя пазыкі ў аднолькавай меры датычыць як гарадзкога, так і сялянскага жыхарства. І сапраўды, ці-ж тыя лішнія дзесяткі міліёнаў рублёў, якія могуць быць дадаткова сабраны, ня будуць мець карысных вынікаў для разьвіцьця вытворчых сіл нашае вёскі і, у першую чаргу, бядняцка-серадняцкіх гушчаў, у зьвязку з распыленасьцю нашае прамысловасьці? Ці-ж тыя дадатковыя міліёны, мэтр паркалю, выробленага на супольна пабудаваных фабрыках, ня пойдуць таксама і на патрэбы нашае вёскі? Нарэшце, ці-ж тыя дзесяткі тысяч новых рабочых, ўцягнутых у нашую прамысловасьць, ня зьменшаць збытковае жыхарства вёскі? Хіба ўсямернае разьвіцьцё нашае прамысловасьці, а разам з тым і ўмацаваньне гаспадарчага базісу нашага краю не ўяўляе сабою вялізарнага эканамічнага фактару ў справе вытворчага ўздыму нашае вёскі, у справе палепшаньня яе дабрабыту?

Вось чаму мы думаем, што той значны час, які застаўся да канца рэалізацыі пазыкі—1-га сьнежня—павінен быць падоўжан у інтарэсах інтэнсыўнасьці прапаганды пазыкі індустрыялізацыі сярод сялянства. Гэтае падоўжаньне павінна быць выкарыстана нашай партыйнай, савецкай і шырокай каапэрацыйнай грамадзкасьцю для растлумачэньня сялянству мэтаў і задач пазыкі. У шмат-якіх раёнах сялянства ня ведае аб тым, што 10 процантаў ад рэалізаванае сумы застанецца на месцы — на культурна-гаспадарчыя патрэбы, а ў некаторых найбольш глухіх мясцовасьцях СССР аб пазыцы нават нічога ня ведаюць. Ёсьць раёны (у Уральскай вобласьці), дзе не рэалізавана пазыкі, водпуск каспандэнцый з месц, ні на грош. У некаторых мясцох, сельсаветы нічога ня робяць, каапэрацыя маўчыць, калгасы трымаюцца далёка ад прапаганды пазыкі, а арганізаваныя спэцыяльна для гэтае працы тройкі вылявілі страшэнную нядбайнасьць.

Партыйным і камсамольскім арганізацыям патрэбна з усёй большавіцкай рашучасьцю ўзяцца за прапаганду пазыкі, трэба ўвязаць гэтую прапаганду в нашай агульнагаспадарчай палітыкай, паказаць непарыўную сувязь посьпеху пазык, са справай гаспадарчага будаўніцтва наогул. У асноў агітацыйнае працы па разьмеркаваньні пазыкі трэба паклясьці шырокае правядзеньне прынцыпу добраахвотнасьці, рашуча адваўляючыся ад усялякіх спроб простага «разрахоўваньня» пазыкі сярод сялянства, ад спробы адміністрацыйнага нажыму, запалохваньня і г. д.

Праца па рэалізацыі пазыкі на вёсцы сустракае адпор з боку кулацкае верхавіны. Кулацтва ня толькі ўхіляецца набываць пазыку, але і спрабуе весьці контр-рэвалюцыйную працу, накіраваную да зрыву пазыкі сярод бядняцкіх і серадняцкіх гушчаў сялянства. І трэба гэта сказаць проста—кулацтва тут не сустракае патрэбнага адпору.

Выпадкі варожага выступленьня працы пазыкі, выпадкі выкрыцьцяня нашае клясавае лініі, накіраваныя сваім астрыём проці інтарэсаў індустрыялізацыі краю, павінны быць пастаўлены пад рашучы абстрэл з боку мясцовых партыйных арганізацый. Вёска павінна раскачацца, павінна ў кароткі час, які застаўся да канчатковае рэалізацыі пазыкі, выказаць максымум актыўнасьці, максымум рэвалюцыйнае энэргіі, вывіць здаровае спаборніцтва з горадам.

Польскі фашызм наглее.

САРВАНА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ДАПАМОГІ ЛОДЗІНЦАМ АД РАБОЧЫХ СССР.

УЛАДА АРЫШТАВАЛА К-Т ДАПАМОГІ БАСТУЮЧЫМ.

ВАРШАВА, 26-XI. Паліцыя апячатала памяшканьне эпэзэраўскага прафсаюзу ў Лодзі, дзе зьмяшчаўся абраны бастуючымі Відзеўскае мануфактуры камітэт па разьмеркаваньні грашовае дапамогі, прысланае рабочымі СССР. Кіраўнікі эпэзэраўскага прафсаюзу арыштаваны.

На думку «Фолькс Цэйтунг», прычынай рэпрэсій зьяўляецца тое, што камітэт дапамогі бастуючым атрымаў грошы ад камфракцыі сойму, у адрас якога яны былі прысланы рабочымі СССР.

Працэс 26-ці украінцаў.

ВАРШАВА, 26-XI. У сьнежні распачнецца украінскі працэс у Львове. Прыцягваецца 26 чалавек. Большасьць падсудных фігуравала пры выбарах у сойм у якасьці кандыдатаў па сьпісу сельробу. Акт абвінавачаньня інкрымінуе падсудным „камуністычную дзейнасьць у Тарнопальскай акрузе".

Арышты украінцаў.

У Рагачыне каля Львова невядомыя асобы перарэзалі ў некалькіх мясцох тэлефонныя драты. Паліцыя зрабіла шэраг рэвізій у навеце, між іншым у украінскім пасэрэтуўным т-ве, у бурсе украінскай гімназіі, у філіі „Прасьвіты". Арыштавана некалькі асоб.

Суд над украінскімі „камуністамі".

10 сьнежня адбудзецца працэс проці 21 члена КПЗУ. Яшчэ ў чэрвені г.г. паліцыя арыш авала ў Тарнопалі 9 асоб і звыш 50 сялян у паколічных паласцёх. Сярод абвінавачаных шмат хто быў кандыдатам з сьпіска „Сельроба" у сойм. Усіх іх абвінавачваюць у антыдзяржаўнай дзейнасьці і здрадзе.

Камуністычныя працэсы ў Ломжы і Ўлацлаўку.

Ломжынскі акруговы суд прыгаварыў нейкага С. Айзэнфіша, абвінавачанага ў камуністычнай дзейнасьці, на 2 гады кропасьці. Улацлаўскі акруговы суд разглядаў справу Гэдалевічавай, Алейнічака, Вавэйчнага, Пэйляка і Паўлавай, абвінавачаных у прыналежнасьці да камсамолу, і прысудзіў іх ад 1-го да 4 з паловай гадоў катаржнага астрогу. Паўлава апраўдана.

Раскол у ППС паглыбляецца.

21 лістапада выступіў з ППС і далучыўся да так званых аваароўшчыкаў яшчэ адзін пасол сойму и Худы. Цяпер у ойміным клюбе аваароўшчыкаў лічыцца ўжо 9 асоб.

ППС і ББС у Любліне.

Між ППС і адкалоўшыміся ад іх аваароўшчыкамі, якіх сталі называць цяпер ББС, —выходзячы ад назвы „Бесспартыйных блёк супрац. з уралам", адбылася гэтымі днямі ў Любліне вастрая сутычка на грунце выразаў недавер'я ў мясцовай радзе. Трэба было выбраць лаўніка ППС і ББС выстасілі сваіх кандыдатаў. Большасьцю 6 галасоў выбралі пэпэсэўца. Пасьля гэтага старшыня мясцовай рады пэпэсэвец Куніцкі выступіў з правазіцыйнай выразу недавер'я прэзыдэнту гораду бэбэсэўцу Поч к і ББС выступіў з правазіцыйнай выказаць недавер'е старшыні рады. Справа пакуль-што скончылася ў нічыю.

Няўдача палк. Славэка.

Гэтымі днямі палк. Славэк, правая рука марш. Пілсудзкага, паехаў у Пазнань, к-б там прачытаць рэферат на тэму: „10цігодзьдзе польскай дзяржавы". Калі ён стаў крытыкаваць дзейнасьць правадыра эн дэкаў Рамана Дмоўскага, у залі падняліся крыкі: «брахня, няпраўда, прэч" і т.п. Пілсудчыкі кінуліся на дэманстрантаў: пачалась бойка. Тады паліцыя выдаліла дэманстрантаў і арыштавала некалькі дзесяткаў іх. Рэферат быў сарваны.

Зачыненьне ковельскай „Просьвіты".

Польская адміністрацыя зачыніла украінскае таварыства „Прасьвіта" у Ковелі. Прычынаю зачыненьня зьяўляецца быццам невыкананьне „Прасьвітай" вымаганьняў закону.

Замах на поезд.

Учачы з 20 на 21 лістапада на лініі Ковель Магіляны на 30 кім. ад Ковеля, на рэйках была пакладзена бэльна, якую заўважыў машыніст поезду. Зьняўшы з рэйкаў перашкоду, поезд накіраваўся далей, аднак зноў неўсёй спыніцца праз некалькі сот мэтраў, бо на рэйках ляжала яшчэ адна запора.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Яшчэ працэс „Грамады".

У Новаградку 27 лістапада распачнецца ў судзе працэс 3-яй групы «Грамады». Паміж абвінавачаных знаходзіцца пасол з «Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу» гр. Стагановіч.

Новая забастоўка ў фабр. „Балтык".

У віленскай фабрыцы кансэрваў «Балтык" зноў пачалася забастоўка. Работнікі зажадалі звальненьня з фабрыкі прынятых у часе забастоўкі новых работнікаў, а калі дырэкцыя ў гэтым адмовіла,—пакінулі працу.

Канфіскацыя „За Працу".

«Слово» (№ 272) паведамляе, што віленская адміністрацыя сканфіскавала апошні нумар беларускае газэты «За Працу». За што, газэта не паведамляе.

Разлом у віленскай ППС.

Віленскае „Слово" (№ 272) паведамляе, што ў Вільні ад ППС аддзялілася група з віленскім радным п. Маркевічам на чале, якая далучылася да новай пэпэсэўскай арганізацыі яваароўшчыкаў.

Зьезд літоўскіх настаўнікаў у Вільні.

23 лістапада ў Вільні адбыўся зьезд літоўскіх настаўнікаў т-ва «Рытас». На зьезд прыбыло некалькі дзесяткаў літоўскіх настаўнікаў і настаўніц з Віленска-Троцкага і Сьвянцянскага паветаў. Выслухана была справаздача аб дзейнасьці т-ва і абгаворан плян асьветы сярод людзьмі.

Бел. Акадэмія Навук і зах. беларусы.

Нават Янка Станкевіч, які апошнімі часамі вусім маўчаў аб дасягненьнях беларускай культуры ў Савецкай Беларусі і аб рашучым удушэньні яе ў Польшчы, змушан быў зарагаваць на факт пераўтварэньня Інбелкульту ў Беларускую Акадэмію Навук і даць хоць кароценькую заметку такога зьместу:

«Нядаўна Інстытут Беларускае Культуры ў Менску ператвораны ў Беларускую Акадэмію Навук. Ператварэньне гэтае мае вялізарнае значэньне для беларускай асьветы, навукі і беларускай справы наогул».

«Беларуская Крыніца» прысьвячае гэтаму пытаньню перадавы артыкул і прызнае за фактам утварэньня Беларускай Акадэміі Навук вялізнае значэньне.

„СЬЕЗДЗТВА" СКОНЧАНА.

ВАРШАВА. 26 XI. Як паведамляе друк, судовае сьледзтва аб львоўскіх падзеях окончылася (гутарка ідзе аб украінскім пагроме, які адбыўся у Львове 1-2-га лістапада, у зьвязку з 10 цігодзьдзем польска украінскае вайны). Справа перададзена ў пракуратуру.

Рэпрэсіі проці паслоў сойму.

На апошнім пасяджэньні сойму маршалак агалосіў прапазіцыі судоў аб выдачы пасноў: Паліва (Укр. кл.), Хама (Сельроблявіца), Лашчынскага (Укр. кл.) і Нохана (Бел. кл.).

Увага: Апошняга прозьвішча сярод на слоў Бел, клюбу да гэтай пары ня было. Відаць, што яно перакручана.

ППС ЗМАГАЕЦЦА ЗА ФАКТЫЧНА СТРАЧАНАЕ.

ВАРШАВА, 26-11. Адкладзеныя з 18-га лістапада на 25 лістапада перавыбары праўленьня лодзінскіх бальнічных кас не адбыліся. Перавыбары адкладзены на гэты раз на невядомы час.

КЯБЫВАЛЫЯ ЛІЧБЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ У АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 21-XI. Водлуг апошніх афіцыйных даных, лік беспрацоўных у Англіі на 12-га лістапада складаў 1.348 200 чалавек. За апошніх некалькі дзён агульны лік афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных, якія атрымліваюць дапамогу, зьменшыўся. Орган рабочае партыі «Дэйлі Геральд» выкрывае сакрэт гэтага „зьмяншэньня" беспрацоўя. Газэта паведамляе, што міністр працы разаслаў у біржы працы сакрэтны абазнік, водлуг якога служачыя біржы павінны паведамляць «тайныя весткі» аб усіх беспрацоўных, якія атрымліваюць дапамогу. На падставе гэтых вестак было адмоўлена ў дапамозе 339.000 беспрацоўных.

Чарноў у Вільні.

25 лістапада прыяжджае ў Вільню б. правадыр б. партыі расейскіх эсэраў, Чарноў мае намер зрабіць даклад. Аб чым будзе гаварыць Чарноў—газэта „Кур. Віл." ня кажа.

Забойства.

Гэтымі днямі быў застрэлены пры вельмі таямнічых абставінах нейкі Кастусь Мароз, жыхар вёскі Чапялі, Шыллоўскай вол. Ёсьць падазрэньне, што Мароз забіты на палітычных матывах. У сувязі з гэтым арыштавана 4 асобы.

Абакралі багача Бунімовіча.

У Вільні ёсьць вядомы багач Бунімовіч які мае ся е магазыны, склады і банкірскія канторы. Нядаўна невыкрытыя злодзеі выкралі з яго складаў 400 окур вартасьцю—35 тыс. злотых. У сувязі з гэтым віленскія газэты наогул адзначаюць што ў горадзе маюць месца шматлікія ўзломы, а злодзеяў ніяк ня злавець.

У Рэйн-Вэстфаліі насьпявае здрада.

РЭФАРМІСЦКІЯ ПРАФСАЮЗЫ Ў СВАІХ УСТУПКАХ ЗАВОДЧЫКАМ ДАЙШЛІ НАВАТ ДА АДМОВЫ АД МІЗЭРНАГА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ЗАРАБОТКУ, УСТАНОЎЛЕНАГА ТРАЦЕЙСКАЙ ПАСТАНОВАЙ.

ПЕРАМОВЫ РЭФАРМІСТАЎ З ЗАВОДЧЫКАМІ.

БЭРЛІН, 26-XI. У палітычных колах лічаць, што абмеркаваньне скаргі прадпрыёмцаў на пастанову краёвага суду па пытаньнях працы ў Дуісбурзе адбудзецца ў апошняй інстанцыі—у вярхоўным судзе на працоўных справах—не раней, чымся праз 3—4 тыдні.

Адначасна сёньня ў Дусэльдорфе адбуўдены перамовы між прадпрыёмцамі рэфармісцкімі прафсаюзамі пры пасрэдніцтве сацыял-дэмакратычнага ўрадавага камісара Дусэльдорфу Бэргмана.

ПРОЦІ ФРОНТУ ТРЭСТАЎ—АДЗІНЫ ФРОНТ МЭТАЛЁЎЦАЎ.

БЭРЛІН, 26-XI. У колах рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці, у зьвязку з пастановаю краёвага суду па пытаньнях працы ў Дуісбурзе, зазначаюць, што рэфармісты бяз згоды рабочых зьнізілі радыйшае патрабаваньне аб павялічэньні заработку ад 16 да 12 пфэнігаў. Потым рэфармісты згадзіліся з пастановаю трацейскага суду, якая прадугледжвала павышэньне заработку ад 2 да 6 пфэнігаў, і нават падалі прапанову абвясьціць гэтую пастанову абавязковай. У выніку-ж усяго рэфармісты ў парадку патайных перамоў у Дусэльдорфе адмовіліся па сутнасьці нават ад гэтага мізэрнага павышэньня заработку.

У зьвязку з такім становішчам, рэвалюцыйная прафсаюзная меншасьць высоўвае наступныя новыя лёзунгі барацьбы: «Пашырайце баявы фронт, узмацняйце барацьбу проці адзінага фронту трэстаў, стварайце адзіны фронт мэталёўцаў, як тых, што ўжо змагаюцца, так і тых, якія знаходзяцца напярэдадні барацьбы і працуюць на тэрыторыі, суседняй з ахопленым лёкаутам раёнам".

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛЁКАУТАВАНЫХ У ДУІСБУРЗЕ.

БЭРЛІН, 26-XI. У часе абмеркаваньня скаргі прафсаюзаў у краёвым судзе па пытаньнях працы ў Дуісбурзе перад будынкам суду і на сумежных вуліцах сотні рабочых, не зважаючы на гураган і лівень, дэманстравалі за патрабаваньне рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці.

ПАГРОЗА ЗВАЛЬНЕНЬНЯ ТЫСЯЧ МЭТАЛЁЎЦАЎ

БЭРЛІН, 26-XI Мясцовая ўлада акругі Арнсберг агаласіла даныя аб наслядках, якія выклікаў у акрузе лёкаут у жалезаробчай прамысловасьці. У акрузе да 21-га лістапада было 203000 прагульных дзён у 84000 рабочых. З прычыны лёкауту страцілі працу 100000 рабочых. Пададзены заявы ад прадпрыёмцаў аб перапынку працы на новых 83-х прадпрыёмствах. Гэта павіне быць працы новых 15000 рабочых.

Замах на недатычнасьць дэпутатаў-камуністаў.

«РЭФАРМАТАРСТВА» ШТРЭЗЭМАНА.

БЭРЛІН, 25-XI. Штрэзэман заявіў на пасяджэньні ЦК народнае партыі, што партыя патрабуе зьмяніць выбарчае права. Гэтыя зьмены павінны адавіць асабістыя дачыненьні між дэпутатам і яго выбаршчыкамі, зьменшыць выбарчыя округі пры захаваньні сучаснае прапарцыянальнае сыстэмы выбараў.

Немэтазгодным зьяўляецца,—сказаў Штрэзэман,—што падрыхтоўка якіх-небудзь учынкаў проці дзяржавы можа прыкрывацца пад абаранаю дэпутацкае недатычнасьці".

ПОСЬПЕХ КАМПАРТЫІ НА ВЫБАРАХ У ДАНЦЫГУ

БЭРЛІН, 22-XI. На вобшчынных выбарах у райёне Вольнага Гораду Данцыгу (якія адбываліся ва ўсім райёне апроч самога Данцыгу) кампартыя атрымала ўсюды значны лік новых галасоў.

Так, у Цапоце камуністы атрымалі 885 галасоў проці 555-ці галасоў у часе мінулых выбараў, а ў Эра 779 галасоў проці мінулых 539-ці.

БУРЖУАЗЕЯ Ў ЗАХАПЛЕНЬНІ АД МЕНШАВІКОЎ.

БЭРЛІН, 23-XI. Нямецкі буржуазны друк з вялікім задаволеньнем адзначае ліквідацыю ўсіх тых перашкод, якія былі на шляху да заснаваньня вялікае каліцыі (аднароднае партыі да сацыял-дэмакратаў уключна), а іменна: пытаньне аб пабудове панцырнага крайсэра, лёкаут у Заходняй Нямеччыне і інш. Друк зазначае, што паводзіны сацыял-дэмакратаў у гэтых пытаньнях сьведчаць „аб здольнасьці сацыял-дэмакратыі браць удзел у кіраўніцтве дзяржавою", і высоўвае нават патрабаваньне распачаць перамовы з мэтаю рэарганізаваць сучасны габінэт ураду вялікае каліцыі.

Пад знакам барацьбы за чыстату ленінскіх радоў.

Пленум ЦКК УсеКП(б).

Інфармацыйнае паведамленьне.

26 лістапада адбываліся пасяджэньні чарговага пленуму ЦКК УсеКП(б).

Пленум абмеркаваў і ўхваліў па дакладзе Арджанікідзэ плян працы ЦКК УсеКП(б)--НК РСІ СССР на 1928-29 год, у зьвязку з чарговымі задачамі далейшае барацьбы з бюракратызмам. Пленум АДНАЗГОДНА далучыўся да пастаноў лістападаўскага пленуму ЦК і даў шэраг дырэктыў аб удзеле КК РСІ ў правядзеньні іх у жыцьцё.

ЦКК УсеКП(б).

Ачысьціць партыю і апарат ад чужых элемэнтаў.

Рэзалюцыя пленуму ЦКК.

Пленум ЦКК УсеКП(б) цалком і поўнасьцю далучаецца да пастаноў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б). Пленум асабліва падкрэсьлівае ўсю важнасьць і значэньне ўхваленых пастаноў аб барацьбе з дробна-буржуазным упливам на асобныя элемэнты нашае партыі, які зьяўляецца як у адкрытым правым ухіле і прыміраючых адносінах да яго, так і ў трацкізьме.

Пленум цалком і поўнасьцю салідарызуецца з ЦК у тым, што на данай стадыі асноўнаю небясьпекаю для партыі зьяўляецца правы ўхіл, проці якога павінна быць накіравана самая рашучая, галоўным чынам, ідэалёгічная барацьба, без паслаблення ўсебаковае барацьбы з трацкізмам.

Праца ўсіх органаў КК-РСІ павінна быць шчыльна зьвязана з выкананьнем пастановаў лістападаўскага пленуму і павінна быць згуртавана, у першую чаргу, на праверцы выкананьня ўхваленых пленумам пастаноў у галіне разьвіцьця індустрыялізацыі краю, і ўздыму абежнае гаспадарчы, у галіне ўмацаваньня сацыялістычных пазіцый, як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы.

Адною з самых сур'ёзных перашкод да выкананьня пастаўленых пленумам задач зьяўляецца стан нашага дзяржаўнага апарату. Таму, у асноў працы органаў РСІ і КК павінна быць наказдзена праца над палепшаньнем і спрашчаньнем савецкага апарату, рашучая барацьба з бюракратызм

Кангрэс прыяцеляў СССР.

БОЛЬШАСЬЦЬ ДЭЛЕГАТАЎ—МЕНШАВІКІ І БЕСПАРТЫЙНЫЯ.—РЭФАРМІСТЫ РЫХТУЮЦЬ РЭПРЭСІІ ЎДЗЕЛЬНІКАМ ЗЬЕЗДУ.

ВЕНА, 16-XI. Учора пры ўдзеле 300 дэлегатаў тут адчыніўся кангрэс аўстрыйскага саюзу прыяцеляў СССР, наладжаны водлуг ініцыятывы аўстрыйскае сэкцыі Міжрабпому. Палова дэлегатаў зьяўляецца сацыял-дэмакратамі і беспартыйнымі рабочымі. Кангрэс абраў ЦВ саюзу большасьць членаў якога складаецца з сацыял-дэмакратаў і беспартыйных.

Орган аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі «Арбэйтэр цэйтунг» перасьцерагае сацыял-дэмакратаў ад удзелу ў кангрэсе. Рэфармісцкі прафсаюз мэталёўцаў ужо выдаў пастанову, у якой радзіць сваім членам устрымацца ад удзелу ў працы кангрэсу.

Урад чорнае рэакцыі.

НОВЫ ЛАТВІЙСКІ ГАБІНЭТ.

РЫГА, 26-XI. Водлуг паведамленьняў газэт, новы ўрад кулацкага сялянскага саюзу, на чале з прэм'ерам Цэльміншам, абапіраецца на кааліцыю, у якую ўваходзяць 54 дэпутаты. Сьпіс міністраў яшчэ канчаткова не зацьверджан.

У левых колах разглядаюць заснаваньне новага ўраду, як адзнаку надыходу рэакцыі. «Сацыял-Дэмакратэс» зьмяшчае артыкул аб новым урадзе пад загалоўкам «Нараджаецца самы чорны ўрад».

У Саюзе ССР.

5-ЦІГАДОВЫ ПЛЯН СЕЛЬСКА-ГАСП. РАЗЬВІЦЬЦЯ.

(На усесаюзнай нарадзе наркомаў земляробства).

МАСКВА, 27-11. Учора ўвечары адчынілася ўсесаюзная нарада наркомаў земляробства саюзных і аўтаномных рэспублік. У працы бяруць удзел наркамземы 17-ці рэспублік Саюзу.

З прывітаньнямі ад імя ўраду УССР выступіў старшыня ўсеукраінскага ЦВК т. Петроўскі, які адзначыў галоўныя задачы нарады.

Усесаюзная нарада наркамзему,—кажа т. Петроўскі,—павінна асабліва завастрыць сваю ўвагу на пытаньні аб будаўніцтве савецкіх гаспадарак, у якое дзяржава ўкладае зараз буйныя сродкі. Праз абмен вопытам нарада павінна намеціць правільныя шляхі да барацьбы з сушшу, па абваднеьні райёнаў стэпу і г. д. Нарэшце, МЕРАПРЫ�ЁМСТВЫ ПА АГРАМАДЖАНЬНІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ ПАВІННЫ СТАЦЬ У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ЎСЯЕ ПРАЦЫ НАРАДЫ.

З вялікім дакладам аб перспэктыўным пяцігадовым пляне разьвіцьця сельскае гаспадаркі выступіў член прэзыдыуму Саюзнага Дзяржпляну т. Вольф.

Перспэктыўны плян—зазначае дакладчык,—грунтуецца на асноўнай вытворчай задачы, якая стаіць перад сельскай гаспадаркай—ДАМАГЧЫСЯ, КАБ У ПРАЦЯГУ БЛІЖЭЙШАГА 10-ЦІГОДЗЬДЗЯ ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў ДВА РАЗЫ. Да ажыцьцяўленьня гэтае задачы трэба падысьці праз пашырэньне засеўных абшараў, зьмены суадносін культур і павышэньне ўраджайнасьці. Усяго за пяцігодзьдзе мяркуецца пашырыць засеўны абшар на 18.4-21 проц., прычым, абшар збожжавых культур павінен павялічыцца на 13-15 проц. Асабліва вялікі рост дасьць плошча ільнаніцы, якая павялічыцца на 30-32 проц. Што датычыць павышэньня ўраджайнасьці, дык на думку Дзяржпляну, у аснову балянсавых разрахункаў, патрэбных для пабудовы плянаў прамысловасьці, транспарту і г. д., трэба пакласьці рост ураджайнасьці за пяцігодзьдзе на 15-16 проц.

Перад сельскай гаспадаркай—гаворыць далей т. Вольф.—стаіць яшчэ адна вялікая задача,—павялічыць вытворчасьць сельска-гаспадарчае сыравіны для нашае прамысловасьці. У зьвязку з гэтым, плян намячае буйны рост тэхнічных культур асабліва-ж бавоўны. Да канца пяцігодзьдзя валавая прадукцыя бавоўны павялічыцца больш, чымся ў два разы, прадукцыя лёну павялічыцца на 61-80 проц. і бураноў на 84 проц. Каб пазбавіцца ад заграничнае залежнасьці, мы ставім сабе задачу ўкараніць у наш х паўдневых і суб-трапічных райёнах эфэтычных культур-кавучуканосныя, эфіраносныя і г. д.

Побач са збожжавай гаспадаркай пэрспэктыўны плян аддае шмат увагі разьвіцьцю жывелагадоўлі, бо гэта прывядзе да карэннае ломкі заатрэлае сыстэмы земляробства, узмацненьня засеву траў і да агульнага ўздыму ўраджайнасьці палевых культур. А каб павялічыць эфэктыўнасьць капітальных укладаў у сельскую гаспадарку, трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на аграмаджаньне жывёлагодзтва, вывучэньне правільных мэтадаў карыстаньня мінэральнымі ўгнаеньнямі ня суровую плянавасьць у справе землеўпарадкаваньня, на расселеньне, меліярацыю і г. д. Землеўпарадкаваньне і расселеньне павінны быць шчыльна зьвязаны з плянам мэханізацыі і аграмаджаньня сельскае гаспадаркі.

Калі мы правільна вырашым усе гэтыя пытаньні дык бясспрэчна даможамся таго, што капітальныя ўклады ў сельскую гаспадарку дадуць большы эфэкт, чымся да гэтага часу.

РОСТ АСЫГНАВАНЬНЯЎ НА ШКОЛЫ І БОЛЬНІЦЫ

МАСКВА. У 1928-29 г. у дзяржбюджэце саюзных рэспублік выдаткі на сацыяльна культурныя матрэбы павялічваюцца на 49,7 міліёнаў проці леташняга году і складаюць больш 349 міліёнаў. 239 міліёнаў прыпадае на асьвету. Выдаткі на асьвету ў РСФСР складаюць каля 140 міліёнаў, у УССР—да 53, БССР—12 з паловаю, у ЗСФСР каля 18 з паловаю, УзбССР—больш 11 міліёнаў, ТуркмССР каля 4 міліёнаў руб.

Лударвайшчына ў Сібіру.

КУЛАКІ ВЫСЬЦЕБАЛІ ГРУПУ БАТРАКОЎ.

ОМСК, 27-XI. Кулакі вёсак Пятроўка, Чунаеўка і Арэхаўка Чугінскага райёну, абвінаваціўшы батракоў у пакражы, пры дапамозе старшыні Пятроўскага сельсавету арыштавалі 10 батракоў, сабралі іх на вёску Пятроўку, высьцебалі і замкнулі ў пуні. Па гэтай справе вядзецца сьледзтва.

ЧАДРА САРВАНА НАВЕК.

БАКУ, 24-XI. 1.500 цюрчанак зьявідася 23-га лістапада без чадры на агульна-жаночую канфэрэнцыю, прысьвечаную 10-цігодзьдзю работніц і сялянак. 4.000 цюрчанак у Баку ўжо скінулі чадру. На супольных сямейных вечарох у клюбах цюрчанкі, якія звычайна зьбіраліся ў спэцыяльных пакоях, зараз удзельнічаюць у працы клюбаў разам з мужчынскай часткай рабочага жыхарства.

Амэрыканскі клюб у Маскве.

МАСКВА. Бюро амэрыканскае сэкцыі Усесаюзна-Заходняе гандлёвае палаты, улічваючы, што ў Маскве заўсёды шмат амэрыканскіх грамадзян, а таксама шмат савецкіх гаспадарчаў, якія цікавяцца Амэрыкаю, прызнала патрэбным адчыніць пры сэкцыі амэрыканскі клюб дзела заснаваньня жывога абмену і сувязі між амэрыканскімі і нашымі гаспадарцамі.

Ідэя заснаваньня клюбу сустракае жвавую прыхільнасьць сярод амэрыканцаў і амэрыканскіх фірм, якія працуюць у СССР.

Забарона выезду ў СССР французскаму рабкору-чыгуначніку.

МАСКВА, 24-11. З Францыі паведамляюць, што падарожжа дэлегата рабкораў-чыгуначнікаў на ўсесаюзную нараду рабсялькораў у Маскве сустрэла перашкоды ў зьвязку з урадавым загадам аб навыдачы дзяржаўным служачым дазволу на падарожжа ў СССР.

«Юманіто» правяла спэцыяльны сход парыскіх рабкораў для выбараў дэлегата.

Бэльгійскія рабкоры прыслалі прывітаньне, дзе выказваюць жаль, што пазбаўлены магчымасьці прыслаць свайго прадстаўніка.

Беларусы ў Амэрыцы.

„Дзеньнік Віл." (№ 267) паведамляе, быццам масовыя (г. ё. віленскія) «дзеячы», з мэтаю дыскрэдытацыі ў Амэрыцы польскай дзяржавы, пры пасрэдніцтве знаходзячыхся ў Злуч. Штатах беларусаў арганізавалі ў Нью-Ёрку і Чыкаго камітэты помачы людзьмі Зах. Беларусі, якая цярпіць голад і нужду». „Дзеньнік Віл." бачыць у гэтым „новы спосаб антыдзяржаўнай прапаганды".

VIII усебеларускі зьезд працаўнікоў асьветы

Старшыня ЦП саюзу працасьветы т. Платун, адчыняючы зьезд, спыніўся на нашым гаспадарчым росьце і тых цяжкасьцях, якія выкліканы гэтым ростам. Клясавая барацьба, якая зараз абвастраецца, выклікала адпаведныя зрушэньні і сярод асьветнікаў. Асноўная маса асьветнікаў, згуртаваная вакол кампартыі, актыўна праводзіць усе тыя мерапрыёмствы, якія вызначыла савецкая ўлада і партыя. Побач з гэтым ёсьць паасобныя адзінкі і нават зьвеньні, якія адбіваюць варожыя нам настроі і выступаюць актыўна супроць тых ці іншых мерапрыёмстваў партыі і савецкай улады і гэтым самым выклікаюць сярод нашай інтэлігенцыі вусім зразумелую клясавую дыфэрэнцыацыю.

Мы маем вялікія дасягненьні на культурным фронце, якія выяўляюцца ў павялічэньні асыгнаваньняў на народную асьвету. Апошняе наша дасягненьне—гэта рэарганізацыя Інбелкульту ў Акадэмію Навук.

Разам з гэтым на паасобных вучастках культурнага фронту назіраюцца тыя ці іншыя ўхілы ў бок ад лініі партыі.

Далей т. Платун спыняецца на становішчы народнай асьветы ў Зах. Беларусі і на тым сацыяльным і нацыянальным уціску, які праводзіць польскі фашызм над працоўнымі Зах. Беларусі.

У заключэньне т. Платун, адзначаючы апошнія выпадкі антысэмітызму, як вылазку нашага клясавага ворага, завастрае ўвагу на неабходнасьці пашырэньня інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Пасьля абраньня прэзыдыуму і зацьверджаньня парадку дню зьезд віталі сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Васілевіч, старшыня СНК БССР тав. Галадзед і старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў.

ПРАМОВА ТАВ. ГАЛАДЗЕДА.

Таварышы, дазвольце ад імя ўраду БССР перадаць вам шчырае пралетарскае прывітаньне.

Таварышы, працоўныя Савецкай Беларусі праз месяц будуць сьвяткаваць 10-годзьдзе існаваньня БССР. Ужо зараз усім працоўным нашай краіны трэба падвесьці вынікі нашай працы за 10 год самастойнай працы па будаўніцтву сацыялізму. Ваш зьезд павінен будзе прагледзець усе галіны савецкага і культурнага будаўніцтва.

Асноўнае дасягненьне Савецкай Беларусі гэта—яе дзесяцёхгадовае існаваньне, як роўнаўзначнай краіны ў сям'і народаў Вялікага Савецкага Саюзу працэўных. Гэтыя дасягненьні ніхто ня можа выкінуць. Працоўныя БССР могуць сказаць, што мы вольна жывём 10 год. Гэтыя гады прайшлі для нас не даремна, мы тую ўстаноўку, якую вызначалі партыя і савецкая ўлада, ажыцьцявілі.

Урад БССР з першых дзён існаваньня паставіў задачу—павялічэньне дзельнай вагі прамысловасьці ў агульнай гаспад рцы Беларусі. Мы можам сказаць, што за гэтыя гады будаўніцтва прамысловасьці мае вялікія дасягненьні. Аб гэтым лепш за ўсё гаворыць лічбы: у даваенны час прадукцыя прамысловасьці складала штогод 40 мільёнаў рублёў. Сёлета ж валавая прадукцыя нашай прамысловасьці ацэньваецца ў 150 мільёнаў рублёў. Калі параўнаць з даваеннымі цэнамі, дык мы маем рост прадукцыі прамысловасьці больш як на 100 пр.

Мы зараз стаім на шляху шырокаразгорнутага будаўніцтва прамысловасьці.

Досыць падаць пару прыкладаў: мы будуем поўным ходам Асінстрой, мы пачынаем будаваць вялікі бэконны камбінат у Воршы; з вясны пачнем булаваць лёнапрадзільны камбінат, фабрыку штучнага шоўку і г. д.

Калі ўзяць вынікі разьвіцьця сельскае гаспадаркі, дык і тут мы таксама маем вялікія дасягненьні. Сёньня сельскую гаспадарку мы ня толькі можам параўнаць з даваенным часам—гэта мы рабілі два гады таму назад, зараз ужо ідуць глыбокія працэсы рэканструкцыі ў сельскай гаспадарцы як у галіне тэхнікі з земляапрацоўкі, так і агрыкультуры.

Мы можам бяз сораму пахваліцца цэлым шэрагам дасягненьняў і ў галіне культурнага будаўніцтва. Ня гледзячы на нашу цемнату і адсталасьць, нашы школы сёлета ахопліваюць 73 процанты дзяцей школьнага ўзросту, гэта значыць у тры разы больш, чым было да вайны. Вельмі каштоўным зьяўляецца дасягненьне ў разьвіцьці навукова-дасьледчай працы. Толькі дзякуючы шэрагу дасьледаў прыродных багацьцяў, мы можам будаваць і разьвіваць новыя віды прамысловасьці.

Ваш зьезд павінен зацікавіцца і дасягненьнямі ў галіне мастацтва і літаратуры. Да дзесяцігодзьдзя БССР мы можам пахваліцца вялікімі дасягненьнямі ў гэтай галіне.

Побач з нашымі дасягненьнямі, у нас яшчэ ёсьць шмат недахопаў, шмат незалатаных дзірак. Наша сацыялістычнае будаўніцтва праходзіць і будзе праходзіць ва ўмовах клясавых супярэчнасьцяй. Будаваць сацыялізм у краіне, дзе прыватная вытворчасьць складае пераважны процант, вельмі цяжка. Толькі таму наша будаўніцтва мае цяжкасьці.

Далей тав. Галадзед спыняецца на дробна-буржуазных хістаньнях, якія часам захапляюць і членаў партыі. Цяжкасьці будаўніцтва мы не павінны замазваць, але мы ацэньваем усе цяжкасьці, як цяжкасьці сацыялістычнага росту, якія ня могуць ня быць, але мы ні на водную хвіліну ня можам затрымліваць росту індустрыялізацыі нашай краіны, росту нашай гаспадаркі, бо мы ня можам тэхнічна адставаць ад капіталістычных дзяржаў. Наша задача—ясна бачыць цяжкасьці, не ўпадаючы ні ў якую паніку, перад якімі-б ня было цяжкасьцямі, аб іх гаварыць і рабіць правільную ацэнку.

Спыняючыся на спэцыяльных задачах асьветнікаў, тав. Галадзед кажа, што партыя і савецкая ўлада даверыла асьветнікам вялікую гістарычную справу—выхаваньне маладога пакаленьня. У БССР па розных навучальных установах выхоўваецца 700 тысяч дзяцей і студэнтаў.

Партыя і савецкая ўлада патрабуе ад арміі культурных працаўнікоў задачу па выхаваньню моладзі выканаць з гонарам. Практыка гаворыць, што асноўныя масы вастаўніцтва правільна вядуць лінію па выхаваньню, але ў гэтай справе ёсьць і ідэалёгічныя вывіхі. Мы павінны весьці самую рашучую барацьбу з гэтымі вывіхамі і адыходамі ад лініі партыі, ад лініі савецкае ўлады.

У заключэньне тав. Галадзед жадае зьезду пасьпяховай працы.

Зьезд гучнымі воплескамі адказвае свайму ўраду, што пастаўленыя перад асьветнікамі задачы яны выканаюць

ДАМО РАШУЧЫ АДПОР КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ.

Арыштавана шайка пагромшчыкоў-контр-рэвалюцыянэраў.

(Па тэлефону ад нашага аршанскага кар-та).

Сьледчымі органамі арыштавана на станцыі Ворша шайка пагромшчы аў 1905 г. членаў саюзу «Михаила архангела», у колькасьці 10 чалавек, якія да гэтага часу займалі адказныя пасады на Аршанскім чыгуначным вузьле ў 1904-1905 г.

Гэта шайка пагромшчыкаў на чале з Любімавым, Ліманскім, Ваўчонкам, Саўтановічам і Мурашка праводзілі манархічную контр-рэвалюцыйную працу, бязьлітасна зьбівалі яўрэяў-рабочых, зьдзекваліся над жанчынамі.

У цяперашні час Любімаў зьяўляўся начальнікам канторы вучастку цягі Аршанскага вузла, прычым адначасова быў атаманам шкодніцкай арганізацыі, якая вяла контр-рэвалюцыйную шкодніцкую працу як у дэпо, так і на станцыі.

Голас менскіх рабочых.

24-га лістапада на менскім піваварным заводзе „Беларуь" адбыўся агульны сход рабочых, на якім была заслухана інф рмацыя аб антысэміцкіх выступленьнях на заводах «Октябрь» і «Большевик».

Агульны сход пастанавіў далучыцца да рэзалюцыі ЦСПСБ аб пакараньні хуліганаў-антысэмітаў.

* * *

У Дзяржпляне БССР адбыўся агульны сход служачых, на якім былі абгавораны факты антысэмітызму на заводах „Октябрь" і „Большевик".

Аднагалосна сход прыняў рэзалюцыю, у якой гэтыя факты антысэмітызму разглядаюцца, як выступленьні клясавага ворага «Трэба ўзмацніць культасьветную працу—гаворыцца ў рэзалюцыі—сярод адстаўшых груп рабочых з аднаго боку і з другога боку—трэба ўжыць самыя рашучыя меры супроць прадстаўнікоў антысэміцкага «фронту».

* * *

24-га лістапада на менскай шавецкай фабрыцы адбыўся агульны сход рабочых, на якім была заслухана інфармацыя аб выступленьнях хуліганаў-антысэмітаў на заводах «Октябрь» і „Большевик".

На агульным сходзе была аднагалосна прынята рэзалюцыя, у якой рабочыя шавецкай фабрыкі патрабуюць вышэйшай кары для антысэмітаў.

ЧУБАРАЎШЧЫНА Ў НОВА-БАРЫСАВЕ.

Уноч з 4 на 5 лістапада згвалчана работніца «Чырвонай Бярэзіны" Поля Л-ва. На паведамленьню старшыні завкому завода імя «Дембаля» т. Новікава ў гэтай ганебнай справе прымала ўдзел чалавек 15, з іх —4 чал. з заводу «Дембаля», 2 чал. з «Чырвонай Бярэзіны«, іншыя ня выяўлены. Арыштавана 26-11 сем чалавек.

Пракуратурай распачата сьледзтва. На агульным сходзе рабочых імя „Дембаля» рабочыя патрабуюць суровай кары над чубараўцамі-гвалтаўнікамі.

Характэрна адзначыць, што старшыня культкамісіі фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна" тав. Наніс ведаў аб гэтай справе з часу згвалчаньня і нікому не паведаміў аб гэтым.

Завкомаўцы імя „Дембаля" і «Чырвонай Бярэзіны» даведаліся толькі тады, калі прыехаў па гэтай справе спэцыяльны карэспандэнт газ. «Рабочай».

Тав. Наніс паведаміў рэдакцыю „Рабочага" праз два з лішкам тыдні.

27-11 на спэцыяльным пасяджаньні прэзыдыуму ЦК саюзу хімікаў будзе стаяць пытаньне аб чубараўшчыне ў Нова-Барысаве, у якой прымуць удзел члены саюзу хімікаў з вышэй паказаных заводаў.

Д. М.

Юр. Лявонны.

„МАЛАДНЯКУ".

(Да 5-цігодзьдзя).

...Вось ідзе зіма. А з ёй—завеі
Запарошаць мой гасьцінец любы...

Памятаю —
ямбы і хорэі...
Вечары з чытанкаю па клюбах.

Каляровае трымценьне. Мора сьвету.
І радкі званчэй ад зор бліскучых...
А шляхі вядуць, вядуць паэтаў
Цераз глыбі,
бор
і злыя кручы!

Па дарозе —
бойкі з шавіністам,
З абываталем і сваркай мешчаніна...
Наша мэта зьзяе прамяніста,
Не запляміць дзён
ніякім чынам!

Так, сябры!

Пяройдзена змаганьне,
І ўстаюць часы клапот, каб чобы...
Груганом—не засьціць наш раньне,
І буяны росквіт—ня угробіць.
На крыжох з'імшэлых і пахілых
Нехта іншы хай распне пары свой!
Маладосьць
крычыць аб сваёй сіле
Кожным крокам,
кожнай творчай рысай.
Хай жыве—цьвіце наша юнацтва!
Дні ўстаюць
вялікаю сяўбой...
Як паходню — пранясем мастацтва,
Калі цемра кінута ў разбор!

23-XI—28 г.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЗАЛАТЫ УРАДЖАЙ!

Яшчэ ня ўся работа зроблена, ня ўсё жніво ў нас пажата.
Я. КУПАЛА.

Наш час зруйнаваў усякія ранейшыя прадстаўленьні аб абхватах, аб маштабах, аб часе. У такія гады, калі старая эканамічная структура разам з усімі сваімі надбудовамі правальваецца ў прадоньне, а на яе месцы вырастае з дня ў дзень новая моцная будыніна—у такія дні нават адзін дзень можа азначыць больш чым у іншых умовах год. Колькі часу трэба было-б у іншых умовах, каб правесьці такую работу, якую правёў наш сёньнешні пяцігадовы імпэтыньнік—аб'яднаньне беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў—„Маладняк"!

28 лістапада 1923 г. гістарычная дата для нашай літаратуры і для ўсяе нашае культуры. Гэта дзень фактычнага афармленьня новага пакаленьня беларускай літаратуры, якому гісторыя судзіла павесьці гэту літаратуру новым шляхам, пад сьцягам новых ідэй, да іншых мэтаў, чымся гэта было раней.

Гістарычная місія „Маладняка", вызначаная тымі-ж фактарамі, якія выклікалі і самае яго ўтварэньне, была, здавалася, не па сілах для энтузіястаў, якія ўзялі яе на свае плечы. У іх ня было ні практыкі, ні звычак, ні мэтадаў, ні літаратурнага аўтарытэту—усё гэта замянялі ім іх цьвёрдая клясавая ўстаноўка, бязьмежная энэргія і бясхрайны энтузіязм. З гэтаю зброяй выступілі яны на барацьбу за ідэалёгічную гегемонію ў беларускай літаратуры, за перастройку яе ідэёвага фронту. У «Маладняка» ня было ніякіх традыцый, якія зьвязвалі-б яго з мінулымі порыдамі беларускай літаратуры—мабыць, гэта забясьпечыла яму, прынамсі на першыя гады, поўнае адзінства, дружнасьць і напорыстасьць у справе дасягненьня пастаўленых задач і поўную ідэёвую супольнасьць. Рашаючым фактарам у справе разьвіцьця „Маладняка" ў першую чаргу зьяўлялася тое бязупынае кіраўніцтва і патрыманьне, якое „Маладняк" атрымліваў з першых сваіх крокаў з боку партыі. І цэнтральныя, і акруговыя партыйныя арганізацыі, і паасобныя працаўнікі ўвесь час прымалі бліжэйшы і жывейшы ўдзел у справе афармленьня маладой арганізацыі. Прадстаўнікі партыі працуюць ва ўсіх зьвеньнях маладнякоўскай арганізацыі, пачынаючы ад ЦБ і канчаючы райённымі гурткамі, яны прымаюць удзел у зьездах і канфэрэнцыях, у вечарынах і парадах, уліваючы ў жыцьцё арганізацыі струмень жывога кіраўніцтва і камуністычнага выхаваньня маладых кадраў беларускай пралетарскай культуры. Маладнякоўцы былі тады адны з першых праваднікоў ідэй камуністычнай партыі ў справе культурнага будаўніцтва, у справе беларусізацыі ў першую чаргу культурна-асьветнага апарату; у гэтай галіне маладнякоўцы выконвалі штодзённую чорную работу, пасьпяваючы ўсюды і ўсюды разносячы іскры сваёй энэргіі, свайго маладога энтузіязму.

Калі пад упливам клясавага распластаваньня прышоў канец адзінству «Маладняка» і частка выдатных яго сяброў, захопленая дробна-буржуазнай навалай, адкалолася ад „Маладняка» і ўтварыла новую арганізацыю „Узвышша", у тыя дні „Маладняк" ня згубіў сваёй лініі. Пераглядзеўшы і рашуча пацьвердзіўшы свае старыя прынцыпы, „Маладняк" вельмі хутка справіўся з часоваю і частковаю разгубленасьцю некаторых сваіх сяброў і разгарнуў работу пастарому. К гэтаму часу „Маладняк" ужо ня быў толькі невялічкім гурткам энтузіястаў.

Гэта была ўжо салідная, сур'ёзная сіла, з якою лічыліся і нашы старэйшыя пісьменьнікі і літаратары братніх рэспублік і нават заграніца. К гэтаму часу прайшла ўсяго часіна „бурапены", лятучых мэтадаў працы, як барацьба з унутранымі групаваньнямі «узвышаўскай» афарбоўкай, як справа ўзаемаадносін з старою беларускаю літаратураю. Многія мерапрыёмствы былі праведзены «Маладняком» упяршыню ў гісторыі беларускай літаратуры. Першым прыкладам гэтага можа служыць выданьне на беларускай мове некаторых твораў лепшых пісьменьнікаў іншакраёвых літаратур. На часопісі «Маладняк» выхаваліся кадры пісьменьнікаў, у творчасьці якіх элементы пралетарскай ідэалёгіі займаюць усё большае і большае месца. Бязумоўна, былі і цяпер яшчэ засталіся ў «Маладняку» людзі, якія ні з пралетарскай літаратурай, ні з яе ідэямі ня мелі і ня маюць нічога супольнага. Але такіх было і ёсьць вельмі мала, і роля гэтых літаратурных прыбудуд павінна зводзіцца да мінімуму.

Сягоньня, калі савецкая грамадзкасьць вітае «Маладняк» з пятаю гадавінаю яго існаваньня, мы павінны выказаць свае меркаваньні адносна яго далейшых шляхоў і тых небясьпек, якія ў сучасны момант яго абкружаюць.

Узяўшы з самага пачатку ў аснову сваёй працы лёзунг культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу, падцьвердзіўшы гэты лёзунг і ў сваіх дэкларацыях і сваёю працаю, «Маладняк» і на далейшы час павінен яго праводзіць у жыцьцё. Кожны маладняковец павінен помніць, што пралетарская культура будзе вышэйшай ступенью агульналадзкай культуры, бо гэта культура вырастае на падставе новых форм эканамічнага жыцьця—на падставе сацыялістычнага будаўніцтва нашай савецкай краіны. Таму першаю задачаю кожнага маладняковца і ўсяе арганізацыі ў цэлым зьяўляецца актыўны ўдзел у гэтым паступовым будаўніцтве сацыялізму, удзел у палітычным жыцьці савецкай краіны, пашырэньне свайго палітычнага кругазору, падняцьце свайго культурнага ўзроўню. Маладняковец павінен ліквідаваць сваю палітычную няпісьменьнасьць і некультурнасьць, якая зьяўляецца ганьбаю для кожнага шчырага ўдзельніка ў сацыялістычным будаўніцтве, у тым ліку і пралетарскага пісьменьніка. Толькі на падставе гэтага „Маладняк" з посьпехам выканае пастаўленую перад сабою задачу—стварэньня беларускай пралетарскай літаратуры.

«Маладняк» і надалей павінен зьбіраць навакол сябе ўсё лепшае, што ёсьць у шырокіх масах рабоча-сялянскай моладзі. Але праз увесь час ёй павінен сурова сачыць, каб у чыстае зерне яго ўраджаю не пападала дробна-буржуазная сьвірэпка. „Маладняк" павінен старанна адсейваць усе лішнія элементы, якія толькі затрымліваюць яго разьвіцьцё.

А. Дудар.

НА ПАЛІТЫЧНЫМ КРУГАВІДЗЕ.

АДЗНАКІ ЎРАДАВАГА КРЫЗІСУ Ў НЯМЕЧЧЫНЕ.

Апошнімі часамі ў Нямеччыне можна заўважыць адзнакі ўрадавага крызісу, які мае свае асяродкам дзьве прычыны: пытаньне аб пабудове браняносца і рурскую забастоўку. Паліты нямецкіх сацыялістаў, якія раней галасавалі за пабудову новага браняносца, выклікала ў шырокіх народных масах незадаволеньне і нават абурэньне. Шмат сацыялістаў пакінула партыю і перайшло да камуністаў. Каб паправіць сваю рэпутацыю, нямецкія сацыялісты раптам унесьлі ў рэйхстаг прапазицыю аб непабудове браняносца. Прапазіцыя, аднак, была адкінута буржуазнай большасьцю рэйхстагу проці сацыялістаў і камуністаў.

Зразумела, што падобная палітычная двулікасьць нямецкіх сацыялістаў не паправіла іх рэпутацыі, а ва ўрадавых сфэрах выклікала нянавісьць і трывогу за сучасны склад ураду, у якім бяруць удзел і сацыялісты. Знаньне рурскіх рабочых з караляміі рурскай прамысловасьці мела досыць грозны характар. Рабочыя выставілі свае дамаганьні надвышкі платы. Каралі прамысловасьці адкінулі гэтыя жаданьні рабочых. Урад запрапанаваў трацейскі суд, які часткаю задаволіў жаданьні рабочых, пры гэтым міністр працы зазначыў, што, на падставе сваіх ацэнак, яго прысуд зьяўляецца абавязковым. Фабрыканты, аднак, не згадзіліся з пастановаю міністра і зьвярнуліся ў суд, які стаў на іх баку. Фабрыканты абвясьцілі лёкаут, уся моц якога скіравана была проці ўмяшаньня дзяржавы ў эканамічныя стасункі, а таксама проці рабочага правадаўства. Пры помачы гэтага лёкауту прамыслоўцы хочуць уплынуць на парлямент у кірунку зьмяншэньня грамадзкіх праў рабочых і ўзаканеньня лёкауту. Зразумела, што сацыялісты з гэтым ня хочуць згадзіцца. Дзеля ўзмацненьня свайго становішча ў парляманце па рабочых справах сацыялісты хацелі-б прыцягнуць да ўлады таксама «цэнтр» і ўтварыць так званую „вялікую кааліцыю", бо і цэнтр апіраецца часткаю на рабочых, тады як нямецкія людоўцы (партыя Штрэзэмана) схіляецца вельмі часта ў бок капіталізму. Перашкодай зьяўляецца рэлігійная школа, якой хоча цэнтр, але якую адкідаюць сацыялісты і людоўцы.

Усе гэтыя разыходзіны, якія існуюць паміж партыямі ўрадавай большасьці Нямеччыны, завастрыліся ў сучасны момант, калі ўзьнікла рурская забастоўка і рубам пастаўлена было пытаньне аб браняносцы. Нямецкія людоўцы прыгразілі нават, што яны адзавуць з габінэту сваіх міністраў (у тым ліку і Штрэзэмана), і гэта ў той момант, калі на сусьветнай арэне мае быць вырашана справа, так для Нямеччыны важная, як праблема рэпарацыі і эвакуацыі Надрэніі.

Словам, прычын для ўрадавага крызісу ў Нямеччыне хапае. Як нямецкія партыі, а галоўным чынам—сацыялісты, выйдуць з гэтых цяжкасьцяў,—пакажа бліжэйшая будучыня.

ПІЛСУДЧЫНА І ПАЯДЫНКІ.

Апошнія дні польскага жыцьця, калі разглядаць яго пераважна на грунце соймавым, адзначыліся надзвычайным напружаньнем узаемаадносін між так званым «Беспартыйным Блёкам супрацоўніцтва з урадам» і партыяй польскіх сацыялістаў. «Беспартыйны Блёк» ці проста «ББ», як прызвычаіліся яго называць у Польшчы, імкнуўся і імкнецца разваліць усе польскія палітычныя арганізацыі, якія ня маюць сваёй мэтай беспасрэднае падтрыманьне ўрадаў марш. Пілсудзкага пад тэю ці іншаю фірмаю. Усьлед за іншымі настаў чарод і за ППС. Гэтая партыя, якая да апошняга часу бахвалілася сваёю адналітасьцю, сваёю цьвёрдаю арганізаванасьцю і вытрыманасьцю, зрабілася апошнімі днямі аб'ектам самых дзікіх нападаў з боку «ББ». Стоіла толькі прадстаўніку ППС, а разам і старшыні соймавага клюбу гэтай партыі п. Марэку сказаць з соймавай трыбуны, што клюб ППС лічыць апошні вывяд маршалка Пілсудзкага аб сойме і дэпутатах шкодным для польскай дзяржаўнасьці, як з боку «ББ» пасыпаліся самыя абразьлівыя рэплікі па адрасу ППС. Справа скончылася тым, што старшыня «ББ» палкоўнік Славэк, бліжэйшы прыяцель марш. Пілсудзкага вызваў на паядынак пэпэсаўскага пасла сойму п. Недзялкоўскага. Вызавы на паядынкі сярод соймавых паслоў сталі прымаць хранічны характар. напружанасьць узаемаадносін між ППС і ББ дайшло да край насьці. Паны з лягеру ББ сталі пагражаць у сваім друку амаль ні разгонам парляманту і расправай з паасобнымі паслами. Вядомы манархіст пан Цат-Мацкевіч у сваім віленскім „Слове" піша: «Кожны канфлікт між клюбам ББ і клюбам сацыялістаў мы вітаем з радасьцю. Не азіраемся і ня хочам азірацца на тых, якія думаюць, што сучасны лад удасца ў Польшчы ўратаваць».

„Нашшуд", як-бы разьвіваючы думкі п. Мацкевіча, прадбачыць, што «наступ на сойм будзе ўзмоцнены і што мэтаю гэтага наступу зьяўляецца пахаваньне польскага парляманцтарызму".

Лева-буржуазны «Наш Пшэглёнд» сьцьвярджае, што санацыя ўсё больш пасоўваецца ўправа і цягне ў бок рэакцыі.

Эндэцкая „Газэта Варшаўска" ў сваім палітычным агляде прыходзіць да выводу, што санацыя зьяўляецца прыхільніцай „злых палітычных звычаяў".

Як бачым, унутраная сітуацыя ў панскай Польшчы вельмі нездаровая

10-ЫЯ ЎГОДКІ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ ЛАТВІІ.

Цэлы шэраг дзяржаў спраўляў нядаўна дзесяцігодзьдзе сваёй незалежнасьці: Эстонія, Латвія, Літва, Польшча. 18 лістапада сьвяткавала свае дзесятыя ўгодкі незалежнасьці і Латвія. Мы знарок спыняемся на гэтых угодках.

Латвія лічыць каля аднаго мільёну васьмісот тысяч людзей, у тым ліку 75 проц. латышоў, 12 проц. расейцаў і беларусаў, 4,5 проц. яўрэяў, 3,3 пр. немцаў, 2,5 проц. палякаў і, урэшце, драбнейшыя лічбы ліцьвіноў, эстонцаў, чэхаў і інш.

Ня гледзячы, аднак, на такую рознанацыянальную насельнасьць, Латвія,—трэба гэта прызнаць,—большменш патрапіла стварыць некаторыя падставы іх супрацоўніцтва. Напрыклад, у галіне асьветы Латвія вядзе троху іншую палітыку, чым Польшча. Пры міністэрстве асьветы ў Латвіі існуюць аддзелы: беларускі, яўрэйскі і польскі, якія аўтаномна кіруюць сваімі нацыянальнымі школамі. Беларускіх школ ёсьць прыблізна 40. Гэтая лічба не адпавядае колькасьці беларускага насельніцтва Латвіі, якое раўняецца 60 тысячам. Апрача пачатковых школ, у Латвіі ёсьць беларуская гімназія ў Дзьвінску. Яўрэйская меншасьць, якая налічвае каля ста т

На фронце культурнай рэвалюцыі.

Культбудаўніцтва павялічваецца.

(Каралінскі р-н, Мазыршчына).

Інтэнсіўні з боку насельніцтва да павышэньня свайго культурнага ўзроўню вельмі вялікія, адсюль самі сяляне вынесьлі цэлы шэраг пастаноў аб адчыненьні новых школ, хат-чытальняў і будаўніцтва апошніх за свае сродкі.

Усяго на тэрыторыі раёну ў 1927-28 годзе існавала 48 школ, з якіх 1 семігодка, 12 двухкамплектных, 32 аднакамплектныя, 1 школа сялянскай моладзі і 2 дагаворныя па нацыянальнаму прынцыпу. Яны падзяляюцца на: беларускія—44, яўрэйскія—2, нямецкія—1 і украінскія—1. У гэтым годзе праведзена належная праца па адчыненьні яшчэ 4-х камплектаў.

У 1927-28 годзе на рамонт школьных будынкаў і будаўніцтва новых школ і клюбу выдадзена 19.000 руб. Адрамантавана усяго 18 дзяржаўных будынкаў—школ. Скончана будаўніцтва 2-х новых школ, набудавана 2 новых. На каштарысу райвыканкомам было асигнавана на гэта 10.000 руб. і ад сродкаў па самаабкладаньню 9.000 руб. У Кльску будуецца новая семігодка, якая будзе скончана ў 1929 годзе.

Усяго ў школах раёну навучаецца 2.566 вучняў, ахоплена школай дзяцей школьнага ўзросту 58,4проц., лік дзяўчат складае 32,4 проц. в агульнага ліку вучняў, па сацыяльнаму становішчу яны складаюцца з дзяцей: беднякоў—27,8 проц., сераднякоў—54,7 проц., служачых—0,8 проц., рабочых—0,6 проц., саматужнікаў—12,9 проц., гандляроў і кулакоў—3,1 проц.

У 1927-28 годзе ў раёнах існавала 17 лікпунктаў, адна вячэрняя школа сялянскай моладзі, і школа маланісьменных—у іх навучалася 580 асоб. У раёне маецца 1 нардом і 3 хаты-чытальні, 7 чырвоных куткоў.

Яўхім.

Сельска-гасп. асьвету--у масы

(Ліст з Бабруйску).

Сельска-гаспадарчая асьвета і сельска-гаспадарчыя веды адыгрываюць дамінуючую ролю ў справе паляпшэньня сельскай гаспадаркі наогул і павышэньня ўраджайнасьці ў прыватнасьці.

На працягу апошняга году на акрузе праведзена даволі значная праца па прасоўваньні сельска-гаспадарчых ведаў у гушчу сялянства. Веды гэтыя праводзіліся шляхам правядзеньня розных сельска-гаспадарчых курсаў, лекцый, гутарак і г. д.

Усяго сельска-гаспадарчых курсаў было праведзена сорак. Правядзеньне іх прыстасоўвалася да ўмоў, каб ад курсаў мець максымальную карысьць, каб атрыманыя веды былі праведзены ў жыцьцё. Лепей-жа іх праводзіць на земляўпарадкаванай плошчы. Такім чынам, курсы праводзіліся сярод сялянства земляўпарадкаваных насельных пунктаў.

Праз курсы прайшло звыш тысячы сялян. Гэта азначае, што тысяча сялян стала актыўнымі правадніками агрыкультурных мерапрыемстваў. Апрача таго, сельска-гаспадарчыя чыткі і гутаркі праведзены ў 1216 насяленых пунктах, абслужыўшы 79 тысяч сялян-слухачоў.

Чым-жа можна даказаць, што ўся гэта аграпрапаганда,дала належныя нарысныя вынікі, а не прапала марна? Папершае, ростам попыту з боку сялянства на 300 проц. супроць мінулага году, ростам ужываньня (пакупкі) сельска-гаспадарчых машын, значна перавысіўшым летаннюю пакупку, пераходам на шматпольле за апошні год 32 тысяч гэктараў зямлі, пашырэньнем пасеву траў і тэхнічных культур і шэрагам іншых мерапрыемстваў.

Роля сельска-гаспадарчых гурткоў, якіх існавала за апошні год на акрузе 78, таксама відаць у гэтых дасягненьнях сельскай гаспадаркі округі.

На наступны год округовы зямельны аддзел яшчэ больш пашырае справу сельска-гаспадарчай асьветы па акрузе. Так, заместа існуючых у мінулым гаспадарчым годзе 40 курсаў, на наступны год іх будзе арганізавана 69. Пашыраецца і іншая агрыясьветная работа.

Пажадана толькі, каб у сельска-гаспадарча-асьветную працу на месцах было ўнесена больш плянавасьці і сыстэматычнасьці, каб гэтая праца мела невыпадковы характар (асабліва гуткі і чыткі), тады ўся гэта аграпрапаганда дасьць яшчэ больш карысныя, больш значныя вынік

Дамброўскі.

Капітальнае будаўніцтва на прадпрыемствах вадасьвету

Гомель, 24 XI. Вадасьвет на капітальнае будаўніцтва сваіх прадпрыемстваў кварталу выдаць 1068000 руб., з іх на абсталяваньне машыннага аддзяленьня—352000 руб., на абсталяваньне кацельнага аддзяленьня—275000 руб., на пашырэньне сеткі—392800 руб. і на розныя пабудовы 48500 р.

Заказваецца турбіна на 7000 кілёват. Будзе пастаўлены эканоммейзер для большай эканоміі ў паліве. Будзе распачата правядзеньне лініі на электраф кацыі Уваравіцкага раёну заводу «Двигатель Революции», які зараз будуецца, і для пабудовы гуты.

Будуць пастаўлены яшчэ 7 новых трансформатных кіёскаў. На вадапроводу будзе пракладзена 12-цідюймовая магістральная лінія, пачынаючы ад водаёмнай вежы да каапэратыўнай і Першачырвонай вул. і шэраг іншых прац.

Дабілі да ручкі.

(В. Юравічы, Полацкага раёну).

Была калісьці ў Юравічах хата-чытальня. Іменна была, бо цяпер яе фактычна няма, хоць пенсію загадчык хаты-чытальні круглы год атрымлівае. Была чытальня ў Юравічах тады, калі загадчыцай хаты-чытальні зьяўлялася нейкая Вайцяхоўская. Тады і газэту знойдзеш, бывала, на стале, і кніжку пачытаеш, і падлога памыта ў чытальні, і сьвету колькі хочаш; словам, была чытальня.

Але прышлі да яе чорныя дні. Ні з сяго ні з таго тав. Вайцяхоўскую звальняюць з пасады, а на яе месца прызначаюць мясцовага селяніна нейкага Вайценку. З гэтага часу і стала яна хата-чытальня, а сродак матар'яльнай дапамогі т. Вайценку.

На цэлых тыдні чытальня была зачынена. Праца заціхла; згрупаваны раней актыў распаўся. Загадчык займаўся паляваньнем, а чытальня стала адзінокаю без адзнак жыцьця. Калі аднаго разу вучні мясцовай школы сталі настойліва прасіць даць ім кнігі, дык т. Вайценка толькі груба аблаяў іх.

Справа дайшла да школьнага савету, на якім вучкон высунуў пытаньне аб грубых адносінах загадчыка хаты-чытальні і зачыненьні доступу ў чытальню.

Праз нейкі час хата-чытальня пазбавілася т. Вайценкі. Яго зьмяніў нех та Даўгала... А справа не палепшылася, нават стала горш. Хата-чытальня зусім засталася без догляду. Бібліятэка зьнішчылася, мэбля паламана.

Паўстае пытаньне чаму на працягу некалькіх год так бязьлітасна нішчыцца дабро і падрываецца аўтарытэт асьветнай установы.

Селькор.

Ха-ха-ха...„Кавалерысты"!..

(З горкага вопыту працы групы «лёгкай кавалерыі» пры мар'інагорскай ячэйцы ЛКСМБ).

— Добры дзень, дзядзька Парончык—прывіталася група «лёгкай кавалерыі»—уваходзячы да старшыні Пухавіцкага РВК.

— Добры дзень! Ну што скажаце?

— Ды мы «лёгкая кавалерыя», акт прынесьлі вам складзены на Мар'іна-Горскі пэдпункт.

— Ха-ха-ха! «Кавалерыя»... ого-го!

— Што-ж яму за сьмех? зьдзівіліся «кавалерысты».

— Слухайце, дзядзька Парончык, ці гэта ў раёне ёсьць камісія садзейнічаньня РСІ?

— Гэтага ня ведаю.

— Дык вось слухайце,—пачаў адзін з «кавалерыстаў»—ведаеце, мы знайшлі ў нашым Мар'іна-Горскім пэдпункце шмат недахопаў, ненавіта:—доктар Розэнталь зусім не зьвяртае на сваю працу ніякай увагі, часта сярод заняткаў сварыцца з сваімі працаўнікамі, груба адносіцца да хворых, нервуецца, курыць у час агляданьня хворых, агляданьне хворых робіцца машынальна і г. д.; лякарствы даюць з брудам, травою, мухамі і інш.; няма ў прыёмнай вады; часта Розэнталь без патрэбы пакідае больніцу і ідзе на кірмаш (які штотыдня бывае ў пасёлку Мар'іна-Горка), а хворыя чакаюць яго. Дык вось вы гэты акт абмяркуйце на пленуме РВК і дайце нам вынікі—закончыў «кавалерыст».

— Гм, добра, паглядзім.

Дні бягуць. Вось і канец верасьня, ужо і кастрычнік... „кавалерысты" чакаюць. Што за ліха—думаюць «кавалерысты», чаму нічога ня чутна? Няўжо Парончык ніякага расьсьледаваньня не вядзе.

Але памыліліся! Акт не пад сукном ляжыць, а ў сукне—кішэні Парончыка. Папершае, Парончык сустрэўся з Розэнталем і расказаў:

— Нейкі там «лёгкі кавалерыст» Сіпач Кастусь абсьледаваў тваю ўстанову і шмат паказаў мне аб табе дрэннага. Дык ты гэта як-небудзь зьнішчы.

— „Хорошо, посмотрим".

Дні зноў бягуць...

І вось у Навасельскай 7-мігодцы, калі Розэнталь рабіў пэдыцынскі агляд вучняў, папаўся яму якраз на вочы гэты самы «кавалерыст» Сіпач К.

— А-а, Сіпач! Ну как это, за что вы писали на меня, зачем все это? И что вам от этого? Останьтесь после занятий, поговорим.

Сустрэў і ўзяў пад апах Розэнталь „кавалерыста".

— Не, выбачайце, мне няма сёньня часу аставацца, мо так калі пагаворым—адказаў Сіпач і вышаў за дзьверы клясы.

Вось як салзейнічае Пухавіцкі РВК працы «лёгкай кавалерыі».

Трэба, каб РСІ зьвярнула на гэта ўвагу.

Міхась Вярба.

Больш увагі радыё.

Шпарка расьце сетка радыёўстановак. Напрыклад, у такім глухім кутку, як, Полаччына за апошні год зьявілася больш 150 новых установак. Няма ніводнай вёскі, няма ніводнай вясковай школы, дзе бы сяляне ці вучні ня імкнуліся да радыё. Кожная шофарганізацыя толькі і чуе ад падшэфных сялян:

— Дайце, браточкі, нам радыё, вельмі ўжо добрая рэч.

І гэта ня дзіва. Радыё заваявала сапраўдны аўтарытэт шырокіх колаў працоўных.

Але мясцовыя арганізацыі да гэтага часу да радыёбудаўніцтва ня маюць патрэбнае ўвагі. Ёсьць яшчэ асобныя таварышы, якія лічаць радыё як «забава на свабодны час». Калі на Полаччыне маецца вялікі рост радыёўстановак, дык гэта праходзіла стыхійна, па жаданьню і ініцыятыве асобных працоўных ці арганізацый. Савецкія, прафесыянальныя і іншыя арганізацыі тут нічога ня робяць, а калі дзе нешта і робіцца, дык гэта зусім не адчуваецца. Нават гэтая справа ацэньваецца і ў мясцовай газэце „Чырвоная Полаччына".

Установы сувязі цягнуцца бясьпечна ў хвасьце ні ініцыятывы, ні кіраўніцтва ні юрыдычнай дапамогі з боку штавікоў няма.

Ня лепш працуюць і арганізацыі „ТПР" (т-ва прыхільнікаў радыё). Возьмем прыклад з тэй-жа Полаччыны. Тут ёсьць акрсавет ТПР, але ён нічога ня робіць. Амаль-што год гутарыць аб выпрацоўцы пляну, але ніяк ня могуць сабрацца сябры савету. Памянёны акрсавет лічыць сваю арганізацыю з 500 сяброў, а ў сапраўднасьці гэта толькі на словах і на паперы; аб сяброўскіх узносах і гутарыць няма чаго. Акрсавет нават ня ведае дзе ёсьць (ці былі) ячэйкі ТПР.

— Былі недзе, ды згубіліся,—гаворыць адзін сябра савету.

Вельмі даўно ідуць размовы аб абсталяваньні рамонтна-заграднага пункту ў Полацку, але справа спыняецца на гэтых размовах. Кансультацыі па радыёпытаньнях няма, у той час як радыёаматар адчувае ў гэтакай вялікую патрэбу.

Апарат сувязі павінен, урэшце, адчуваць адказнасьць за працу па радыёбудаўніцтву.

Бел кіраўніцтву сувязі трэба ад сухіх абежнікаў перайсьці да практычнай працы, чаго зараз няма. Асабліва патрабуе ўвагі вёска да яё радыёфікацыі. Яна забыта намі ў гэтай справе. Зусім невыпадкова сказаў сялянскі сход Махіроўскага с-с. у рэзалюцыі па дакладу загадч. Полацкай к-ры сувязі:

— Дапамажэце нам, сялянам у радыёфікацыі.

А колькі ёсьць гэтакіх просьбаў?

Адначасова трэба выжыць нядбалыя адносіны да задавальненьня радыёапаратурай. Напрыклад, полацкі саюз сувязі ў лютым г. г. зрабіў у Менск заказ на 4-хлямпавы прыёмнік „БЧ" і атрымаў яго толькі ў лістападзе.

Трэба абвясьціць радыёсаход, пабудаваць закон гэтай важнай справы шырокую грамадзкую думку, паставіць радыёбудаўніцтва пад агонь самакрытыкі.

Больш увагі культбудаўніцтву, больш увагі радыё, як адной з форм культбудаўніцтва.

Мік. С.

Полацак.

ГАВАРЫЛІ ШМАТ, А ЗРАБІЛІ МАЛА.

(В. Кабыльле, Ляднянскага р., Аршаншчына).

Шмат гаварылася пра культурны паход на адным са сходаў Кабыльскай камсамольскай ячэйкі ЛКСМБ. Перад кожным камсамольцам была пастаўлена задача, каб ён змагаўся з нянісьменнасьцю і некультурнасьцю вёскі. Шмат было спрэчак, дзе камсамольцы і беспартыйныя выказваліся аб неабходнасьці ўзьняцьця сьвядомасьці і культурнасьці вёскі.

Кабыльская ячэйка ЛКСМБ пастанавіла, каб кожны камсамолец навёў рашучую барацьбу супроць цэрквы і некультурнасьці. Для гэтага вылучаны камсамольцы на барацьбу з п'янствам, хуліганствам, бюракратызмам і нянісьменнасьцю.

Але як дайшло да справы, дык нічога ня зроблена. Гаварылі шмат, але зрабілі вельмі мала. У нашай вёсцы Кабыльле знаходзіцца студня, якая не дагледжана і запоўнена сьмецьцем. Ад гэтага ў ёй і кепская вада, ад якой можна захварэць.

Санітарная камісія нічога ня робіць. Культурны паход пачаўся і трэба правесьці тыя пастановы, у якіх казалася аб культурным паходзе.

Маі—скі.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

24 лістапада г. г. пад старшынствам тав. А. Г. Чарнякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні.

АА БАРАЦЬБЕ З ДЗІЦЯЧАЙ БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ НА ТРАНСПАРЦЕ.

Заслухан даклад упаўнаважанага Наркамшляхоў Зносін аб барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю на транспарце.

Барацьба з бяспрытульнасьцю на транспарце Беларусі пачалася з 1926-1927 году і згрупавана на МББ і Зах. чыгунках.

На абедзьвюх дарогах пры аддзелах есьць веты арганізаваны міжведамсьцьвенныя камісіі па барацьбе з бяспрытульнасьцю.

Спэцыяльныя ўстановы дзеля барацьбы з бяспрытульнасьцю на МББ чыг. зьяўляюцца—Гжацкі прыёмнік вагон-цяплушка і ядры, арганізаваныя на ўсіх буйных станцыях.

На Заходняй чыгунцы пералічаных устаноў няма, бяспрытульныя дзеці, затрыманыя на дарозе перадаюцца Гомельскаму округоваму Таварыству „Друг Дзіцей".

За час болей году па абедзьвюх дарогах было разьмеркавана 658 бяспрытульных,

Нараджэнцаў Беларускай Рэспублікі затрыманых на чыгунках—усяго 380 чалавек.

Частка дзяцей накіравана ў дзіцячыя ўстановы,—на вытворчасьць, да родных, астатнія—ж дзеці знаходзяцца ў Гжацкім прыёмніку і вучацца ў школах.

Паступаючыя ў прыёмнік падлеткі падвяргаюцца сан. апрацоўцы, першыя дні пакіньчаюцца ў каранціне, а пасьля індывідуальна-педалёгічнага дасьледваньня пераводзяцца ў агульныя спальні.

Пры прыёмніку маецца ўрач-педалёг і абсталяваны габінэт.

Пры прыёмніку маецца бібліятэка і працуе бібліятэчны гурток.

Арганізав ны і працуюць гурткі—драматычны, пераплётны, радыё і фізкультуры.

Працуюць дзьве майстэрні—сталярная і сапожная.

З жніўня месяца на дарозе курсіруе вагон-цяплушка на барацьбе з бяспрытульнасьцю. Вагон зьявіцца злучаючым звяном паміж ядрамі і прыёмнікам.

У 1927-28 г. было адпушчана Цэнтральным Кіраўніцтвам Транспарту Асьветы МББ чыг.—39.544 руб., якія цалкам пайшлі на работу Гжацкага прыёмніка.

На Зах. чыг. адпушчана было 35.259 руб., якія і пайшлі поўнасьцю на ўтрыманьне дзяцей, перадаваемых т-ву „Друг Дзяцей".

Прэзыдыум ЦВК па заслуханаму дакладу пастанавіў:

Прымаючы пад увагу, што бяспрытульнасьць на транспарце прыносіць шкоду народнай гаспадарцы, прапанаваць упаўнаважанаму НК Шляхоў Зносін і адміністрацыі чыгунак узмацніць барацьбу з бяспрытульнасьцю на транспарце; даручыць ЦК Дапамогі Дзецям разам з адпаведнымі органамі ў бліжэйшы час распрацаваць мерапрыемствы па палепшаньні справы барацьбы з бяспрытульнасьцю на транспарце; прапанаваць органам НК Шляхоў Зносін працу па барацьбе з бяспрытульнасьцю на транспарце праводзіць разам з округовымі выканаўчымі камітэтамі, камісіямі дапамогі дзецям і органамі наркамасьветы; зьвярнуць увагу ўпаўнаважанага НК Шляхоў Зносін на неабходнасьць узмацненьня працы на вылаўліваньні бяспрытульных на транспарце і перадачы іх у адпаведныя дзіцячыя ўстановы.

ПРА ПЕРАДАЧУ ГАРАДЗКІМ САВЕТАМ ГАРАДЗКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І МАЕМАСЬЦІ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад НК РСІ аб выніках перадачы гарадзкім саветам гарадзкіх прадпрыемстваў і маемасьці, у адпаведнасьці з пастановамі Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР і Прэзыдыуму ЦВК БССР па гэтым пытаньні.

З дакладу Наркам. РСІ высьветлілася, што гарсаветам округовых гарадоў БССР гарадзкая маемасьць ужо перададзена, што-ж датычыцца раённых гарадоў, дык гэтая перадача яшчэ ня ўсюды мела месца (не перададзена ў раённых гарадох на 2 округах).

Прэзыдыум ЦВК прыняў даклад НК РСІ да ведама і катэгарычна прапанаваў акрвыканкомам да пачатку 1929-30 бюджэтнага году перадаць усім гарсаветам маемасьць і прадпрыемствы гарадзкога значэньня і даць тлумачэньне аб прычынах неперадачы да гэтага часу.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

Згодна пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, тав. Варашылаў А. Р. аслабанён ад абавязкаў старшыні Вярхоўнага Суду БССР.

Тав. Валасевіч П. Я. аслабанён ад абавязкаў Намесьніка Наркамасьветы БССР і назначан Старшынёй Вярхоўнага Суду і Намесьнікам Народнага Камісара Юстыцыі БССР.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Чарговае пасяджэньне Савету Народных Камісараў адбылося 26-га лістапада г. г. пад старшынствам Нам. Старшыні СНК тав. Каркліна, М. М. На гэтым пасяджэньні былі разгледжаны разам з іншымі наступныя пытаньні.

АБ АДЧЫНЕНЬНІ НОВЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ.

СНК дазволіў Народнаму Камісарыяту Асьветы адчыніць прадугледжаныя на каштарысу на 1928-29 год наступныя навучальныя ўстановы: 1) полацкую прафшколу агнятрывалага будаўніцтва з 15 лістапада г. г., 2) барысаўскі вячэрні рабфак з 15 сьнежня г. г., 3) вячэрні рабфак для сялян у мяст. Дукоры з 15 сьнежня г. г., 4) тры аднагадовыя курсы для піанэр-важатых і 5) адны курсы (4-х-месячныя) для падрыхтоўкі работніц і батрачак для паступленьня на рабфак.

ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ СКЛАДУ КАЛЕГІІ ПРЫ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫ ЗЕМЛЯРОБСТВА.

Калегія пры Народным Камісары Земляробства зацьверджана ў наступным складзе: Масюкоў, К. Н. (нам. Камісара), Адамовіч, А. Т. (нам. Камісара), Шычко, А. І., Вашчыла-Вірыц, М. Г, Тамковіч, Н. Г., Філатаў, І. П., Гарэцкі, Г. І., Дубіна, А. В., Аксючыц, Н. Л., Вайтэнкаў, Ц. К., Тафеенка, С. І. і Сьмірноў, І. Н.

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ СЫСТЭМЫ С.-Г. КРЭДЫТУ.

Гэтымі днямі пры Белсельбанку адбылася нарада старшынь с.-г. крэдытных т-ваў. Нарада абгаварыла цэлы шэраг важнейшых задач, якія стаяць зараз перад сыстэмай с.-г. крэдыту.

КРЭДЫТНЫ ПЛЯН НА 1928-29 Г.

Гэты плян разам з спэцыяльнымі сродкамі на правядзеньне кантрактацыі і фондам мэліярацыі—дасягае 31 мл. руб., што, у параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 60 проц.

Плянавасьць, як асноўны спэцыялістычнага будаўніцтва, павінна зрабіцца асноўнай працай у установах сыстэмы с.-г. крэдыту. У плянавую працу трэба ўцягнуць і нізавое зьвяно сыстэмы.

Кожнае зьвяно сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту павінна мець у сябе спэцыяльны плян крэдытаваньня бядняцкіх гаспадарак з ухілам уцягненьня іх у вытворчае каапэраваньне.

Праблема кантрактацыі таксама вымагае належнае ўвагі, бо кантрактацыя мае шчыльную сувязь з вытворчымі працэсамі сельскай гаспадаркі. Гэтую ўвязку кантрактацыйных крэдытаў з іншымі мэтавымі вытворчымі крэдытамі трэба ўзмацніць. Таксама трэба зварачаць належную ўвагу на падрыхтоўку па правядзеньню пасеўных кампаній. Кожнае зьвяно сыстэмы павінна не пазьней 1-га сьнежня скласьці спэцыяльны плян забесьпячэньня крэдытам мерапрыемстваў па вясеньній пасяўной кампаніі, і не пазьней 1-га сакавіка—па азімай пасяўной кампаніі. Гэтыя пляны павінны быць сьпісаны ўвязаны з плянамі земельных органаў і сельска-гаспадарчай каапэрацыйнай арганізацыяй.

БОЛЬШ УВАГІ ЎЦЯГНЕНЬНЮ СЯЛЯНСКІХ СРОДКАЎ.

Да гэтага часу ў сыстэму сельска-гаспадарчых крэдытаў вельмі мала ўцягнута сялянскіх сродкаў.

Каб зрабіць рашучы пералом па прыцягненьню мясцовых сродкаў, трэба не ў парадку кампаніі, а штодзённа весьці актыўную працу ў гэтым напрамку. Неабходныя ўмовы прыцягненьня ўкладу зьяўляецца давер'е да т-ва. Таварыства не павінна дапускаць рызыкоўных і стратных аперацый, яно павінна паведаміць насельніцтву, што за цэласьць укладаў у т-ве адказвае разам уся сыстэма сельска-гаспадарчага крэдыту, трэба арганізаваць шырокую справаздачасьць кіруючых органаў т-ва перад пайшчыкамі, трэба дабіцца, каб усе свае вольныя сродкі РВК і інш. установаў трымалі на бягучых рахунках т-ва.

Формамі прыцягненьня сялянскіх сродкаў, як і раней, павінна зьяўляцца: поўнае спагнаньне пазных узносаў і ўзносаў у спэцыяльныя капіталы. Прыём авансаў на с.-г. машыны, прылады і інш., шырокае разьвіцьцё ўкладных аперацый і інш.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦІ С.-Г. КРЭДЫТУ.

Вывучэньне эфэктыўнасьці с.-г. крэдыту праводзілася сёлета экспэдыцыяй Навукова-Дасьледчага Інстытуту, якая абсьледавала звыш 110 паселішчаў і каля 4000 гаспадарак.

Апрацаваная частка матар'ялаў паказала, што крэдытныя адносіны вёскі разьвіты яшчэ даволі слаба. Крэдытнымі ўзаемаадносінамі ахоплена менш паловы гаспадарак, з якіх прыблізна тры чвэрці ахоплена крэдытнымі т-вамі і адна чвэрць інш. установамі і прыватнымі асобамі. Адгэтуль вынікае, што трэба яшчэ больш узмацніць тэмп каапэраваньня сялянскіх гаспадарак.

Вёска ўсё яшчэ вельмі мала насычана крэдытамі. Адчуваецца вострый недахоп у грошах, асабліва на штучнае ўгнаеньне, на корм для жывёлы і палепшанае насеньне.

У выхадку з недахопам крэдытаў на корм для жывёлы гаспадаркі, пераважна бяднейшыя, маюць даволі вялікія страты на кошце жывёлы і яе прадукцыйнасьці.

Малая насычанасьць крэдытамі індывідуальных гаспадарак пры вялізарных запатрабаваньнях вёскі ў крэдытах надае надзвычайна вялікае значэньне праблеме прыцягненьня ў сыстэму с.-г. крэдыту вольных сродкаў вёскі.

Абслугоўваньне крэдытамі бядняцкіх гаспадарак паляпшаецца; гаспадаркі, абслужаныя с.-г. крэдытам, эканамічна растуць значна хутчэй, чым гаспадаркі не абслужаныя. У такіх гаспадарках адносна хутчэй уводзіцца інтэнсыфікацыя с.-г., найвялікшы эфэкт атрымоўваецца ад пазык на насеньне траў, і самая нізкая эфэктыўнасьць крэдыту—на прадукцыйную жывёлу.

У НОВАЙ ВОПРАТЦЫ.

(Агляд фабр.-заводзкіх друкаваных газэт).

Шматтыражных друкаваных фабрычна-заводзкіх газэт на Беларускай ССР Рэспубліцы набіраецца прыблізна з дзесятак: — „Метпромовец", «Сигнал», «Ножницы і Пресс», «Красная Очковица»—у Віцебску, «Рабочее Око», „Голас краўца"—у Менску, «Заводзкі Гудок»—у Мазыры і «Чырвоны Бярэзінец»—у Барысаве. Ёсьць яшчэ адна, дзьве газэты ў Гомельшчыне.

Як бачыце, колькасьць друкаваных фабр.-заводзкіх газэт невялікая і раскіданы яны па некалькіх гарадох нашае краіны. Да таго-ж, усе гэтыя газэткі маладыя, новыя, пачалі выходзіць толькі ў апошні год. Найраней шая налічвае толькі 10 нумароў.

Газэты маладыя, але здаровыя. Вырасьлі яны на здаровым грунце па ініцыятыве і пры энэргічным удзеле шматлікай рабкораўскай арміі. Шматтыражныя фабрычна-заводзкія газэты вырасьлі з насьценных газэт і «ільлічовак» і зьяўляюцца арганічным працягам сваіх папярэднікаў.

Агульнай прычынай пераходу насьценгазэт плякатных і «ільлічовак» у форму друкаванай газэты з тысячным і нават большым тыражом трэба лічыць наш эканамічны і культурны рост. Растуць, узмацняюцца, буйнеюць нашыя фабрыкі, заводы. Павялічваюцца кадры пралетарыяту; апошнія ўсё болей і болей пачынаюць уцягвацца у актыўную работу па наладжаньню сваіх прадпрыемстваў.

Расьце і культурны ўзровень пралетарыяту. З свайго асяродзьдзя пралетарыят вылучае ўсё большыя і большыя кадры рабочых карэспандэнтаў. На больш буйных прадпрыемствах, дзе лік рабкораў перавальвае за паўсотню, цесна ўжо зрабілася працаваць ля маленькай насьценнай газэты як плякатнай, так і «ільлічоўкі». Гэта і было непасрэдным штуршком да пераходу на друкаваную газэту.

Разгорнутая кампанія самакрытыкі, пастаноўка пытаньня аб пашырэньні культурна-масавага выхаваньня рабочых яшчэ болей ускладнілі работу фабрычна-заводзкіх газэт. У старых рамках стала цесна. Цэнтральныя і акруговыя газэты не маглі скарыстаць усяго дасьлаемага ім матар'ялу; насьценныя газэты, з прычыны прытоку матар'ялаў, павінны былі спачатку перайсьці на «ільлічоўкі». Але апошнія зьявіліся стымулам да яшчэ большага павялічэньня ліку рабкораў і, як непасрэдная неабходнасьць, паўстала пытаньне аб пераходзе да друкаванай газэты.

Вось аб гэтым яскрава кажа сама газэта. У № 1 газэты «Сигнал» (Віцебск) пішацца:—«Паступаючы матар'ял абганяў усякія магчымасьці яго скарыстаньня. Насьценныя (палосныя) адышлі ў мінулае, іх замянілі «ільлічоўкі» на кароткі перыяд часу (4 месяцы), але яны-ж і «ўгробілі» самі сябе, бо болей часты выпуск [illegible] новыя калёны рабкораў, якія сваімі карэспандэнцыямі запружвалі памяшканьне рэдакцыі».

Цікавасьць рабочага да прафесыянальнага, партыйнага і вытворчага жыцьця на сваім прадпрыемстве павялічвалася, узрастала, а насьценная газэта не магла адлюстраваць усяго разнастайнага жыцьця нашае фабрыкі, і гэта зьявілася другою прычынаю неабходнасьці перайсьці на болей пашыраны выпуск газэт.

Але хопіць даказваць неабходнасьць такога пераходу. Апішам некалькі новых газэт. Яны самі будуць гаварыць за сябе.

Перад намі адна з старэйшых з шматтыражных фабрычна-заводзкіх газэт на Беларусі—«Метпромовец» газэта рабочых і служачых заводаў «Чырвоны Мэталіст» і «Камінтэрн» у горадзе Віцебску. Першы нумар быў выдадзены 8-га чэрвеня 1928 году. Усяго ўжо выдадзена дзевяць нумароў. З другога нумару газэта пачала выходзіць два разы ў месяц, а цяпер ужо ёсьць думка аб тым, каб „Метпромовец" выдаваць праз кожныя дзесяць дзён.

З першага-ж нумару „Метпромовец" узяў пад агонь самакрытыкі вытворчыя непаходы як на заводзе „Чырвоны мэталіст", так і на заводзе «Камінтэрн».

У наступных-жа нумарох праводзіўся [illegible] агляд заводу „Чырвоны Мэталіст". Вытворчы агляд адкрыўся, праўда, залішне вялікім артыкулам „В заводском омуте" Рамана Майскага. Прычым на тэй-жа старонцы мелася яшчэ ня менэй двух артыкулаў таго-ж аўтара. У далейшым справа пашла на палепшэньне: у вытворчым агляде пачалі прымаць удзел шмат карэспандэнтаў. Заметкі сталі карацейшымі, болей канкрэтнымі, лік заметак павялічыўся да 20-ці і болей. Апроч рабочых, у агляд былі ўцягнуты і інжынэрна-тэхнічныя сілы фабрыкі. Такім чынам, агляд перайшоў у вялікую ўсебаковую праверку вытворчае работы на фабрыцы. Агляд яшчэ працягваецца, і трэба чакаць, што ён дасьць добрыя вынікі.

Апроч сыстэматычнае падачы матар'ялаў вытворчага агляду, „Метпромовец" адклікнуўся на шэраг іншых патрэбных пытаньняў. Асаблівая ўвага зьвярталася на пытаньні самакрытыкі, асьвятленьне ходу падпіскі на другую пазыку індустрыялізацыі. Газэта шмат зрабіла ў справе прасоўваньня культурнае рэвалюцыі ў рабочым быце, у справе барацьбы з лаянкаю, бруднасьцю, нянісьменнасьцю. Між іншым, газэта за гэты час зьмясьціла некалькі артыкулаў да тароў аб зубных, вэнэрычных і іншых хваробах.

Газэта, як відаць, уцягнула ў рабкораўскую справу значны лік рабочых, утварыла навакол рэдакцыі групу рабкораўскага актыву. У выніку—у апошні час у газэце ўжо зьмяшчалася да 50-ці і болей рабкораўскіх заметак.

Разам з тым маюцца і значныя недахопы Я ўжо не кажу аб шэрагу тэхнічных недахопаў, як у вёрстцы і разьмеркаваньні матар'ялаў, але настойліва трэба зьвярнуць увагу рэдакцыі на тое, каб не зьмяшчаліся артыкулы ў 200, 250 і нават у 750(!) радкоў Можна памірыцца з артыкуламі ў 100, 150 радкоў, але ні ў якім разе нельга даваць артыкулы ў 750 радкоў. Рэдакцыі трэба ведаць, што маса рабочых такіх артыкулаў чытаць ня будзе. А газэта менавіта павінна ўзяць курс на іх.

Ня лішне будзе падкрэсьліць і тое, што „Метпромовец" зьвяжэ ў тым ліку некалькі артыкульчыкаў на яўрэйскай мове і два на беларускай. Гэта ў дзевяці нумарох! Ці не замала? Пры такой пастаноўцы справы практычнае пераламленьне нацыянальнае палітыкі партыі далёка ня пойдзе. У гэтым напрамку трэба жадаць лепшага.

Газэта «Заводзкі Гудок» рабочых, аб'яднаемых ячэйкай камбінату ў гор. Мазыры, пачала выдавацца з 1-га верасьня па ініцыятыве рабкора газэты «Савецкая Беларусь»—тав. Саф'яна. Прафесыянальная арганізацыі да справы выданьня друкаванай газэты спачатку аднесьліся з недавер'ем.

— Нічога ня выйдзе.

— Прападуць толькі насьценныя газэты.

— Няма грошай.

Апошняе можна лічыць за самы «важны» аргумэнт. Не хацелася мясцкомам усяго на некалькі рублёў у месяц з культфонду асигнаваць на такую патрэбную справу. Але ініцыятары перамаглі. Грошы сяк-так сабралі, а іх патрабавалася, праўду сказаць, ня шмат. Кошт нумару ў 1000 экземпляраў пры малым фармаце „Заводзкага Гудка" каштуе 42 рублі. Ад прадажы, на 3 капейкі экземпляру, выручаецца каля 30-ці рублёў. «Датацыя» патрабавалася невялікая.

За два з паловаю месяцы існаваньня «Заводзкага Гудка» выйшла 6 нумароў.

Першы нумар адбілі ў 600 экземпляраў, і ён адразу быў разабраны. Цікавасьць да газэты з боку рабочых увесь час расьце. Павялічваецца падпіска, павялічваецца і лік дапісчыкаў.

Газэтка, як правіла, выдаецца на трох мовах. Праўда, за апошні час матар'ялу на беларускай і яўрэйскай мовах падаецца ўсё меней і меней. Лік рабкораў навакол газэты расьце ўсё больш і больш.

Спачатку некаторыя т. т. прафработнікі гаварылі, што калі газэта будзе друкаванай, дык пажылы рабочы не набярэцца сьмеласьці пісаць у яе. Але рабочыя аднесьліся да справы інакш: друкаваная газэта яшчэ болей заахвоціла іх да ўдзельнічаньня ў друку

Цяпер ёсьць болей 5-ці сталых рабкораў.

Газэтка хоць і маленькая, але, выходзячы два разы ў месяц, мела магчымасьць своечасова адклікнуцца на ўсе важнейшыя задачы дню. Тут і ўмелая прапаганда за пазыку, і правільны напрамак у самакрытыцы, і барацьба за культуру ў рабочым быце. «Заводзкі Гудок» своечасова і трапна адбіваў выхіхі ў вытворчай рабоце гаспадарчых арганізацый і ўскрыў нядобраякасную работу некаторых гаспадарнікаў. У выніку

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

аб назначэньні тав. Бергмана, Я. Х. Упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

Згадзіцца з назначэньнем тав. Бергмана, Яна Хрыстофаровіча Упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконаў.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
27 кастрычніка 1928 году
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о назначении тов. Бергмана, Я. Х. уполномоченным Народного Комиссариата Почт и Телеграфов Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

Согласиться с назначением тов. Бергмана, Яна Христофоровича Уполномоченным Народного Комиссариата Почт и Телеграфов Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
27 октября 1928 года
г. Минск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу Глускага местачковага савету.

Выслухаўшы даклад Глускага местачковага савету Бабруйскай акругі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Адзначыць у працы савету наступныя дасягненьні:

1) некаторае ажыўленьне працы савету праз: а) больш рэгулярнае плянавае правядзеньне пасяджэньняў прэзыдыуму і пленуму савету; б) пастаноўку на вырашэньне прэзыдыуму і пленуму пытаньняў гаспадарча-культурнага будаўніцтва; в) некаторае прыцягненьне да ўдзелу ў працы савету ме тачковага актыву і г) разгортваньне працы камісій пры местачковым савеце і розных дабраволных грамадзкіх арганізацый (Асоавіяхім, Моор і інш.);

2) удзел местачковага савету ў працы па ўпарадкаваньні мястэчка і мацуньня некаторыя рэальныя выгады гэтай працы спрыялі палепшаньню палітычных настрояў насельніцтва, падняцьню актыўнасьці беднаты.

II. Побач з гэтымі дасягненьнямі ёсьць наступныя недахопы:

1) з разгледжаных саветам пытаньняў малы процант (толькі 30 проц.) складаюць гаспадарча-культурныя пытаньні;

2) савет зварачвае невыстарчальную ўвагу на працу камісараты, дзякуючы чаму процант камісараваных гаспадарак, асабліва па сельска-гаспадарчай камісарацыі, нязначны, а таксама вязначны ўдзельны сродкі ўсіх відаў камісарацыі. Да арганізацыі працыйшых відаў камісарацыі (малочных, машынных, птушыных, гародных і інш.) амаль ня прыступлена;

3) марудна вядзецца праца на гаспадарчаму ўпарадкаваньню мястэчка, у пасобку па земляўпарадкаваньні;

4) мала зьвярнута ўвагі на арганізацыю арцеляў на перапрапоўцы мясцовага сыру і па вырабу больш ходкай мясцовай і экспортнай прадукцыі (цаглянае, чарапічнае, смалакурнае і інш.);

5) ня зусім сталы падыход пры правядзеньні розных палітычных кампаній, у пасобку па самаабкладаньні, несваячасовае рэгаваньне і кіраўніцтва з боку райвыканкому ў такіх выпадках;

6) адсутнасьць належнага кіраўніцтва і дапамогі існуючым арцелям з боку Белкустрамсаюзу, дзякуючы чаму арцель па вырабу саломкі вельмі часта, за адсутнасьцю сарцу, працуе з перабоямі і ўвесь час павінна трымаць сувязь з прыватнікам, праз якога выключна прымушана збываць сваю прадукцыю.

III. У далейшай працы местачковага савету СНК прапануе кіравацца наступным:

1) не паслабляць увагі на ажыўленьні працы местачковага савету і камісій пры ім, яшчэ больш упягваць у гэту працу местачковую беднату, яшчэ шырэй разгортваць працу па ўцягненьні местачковага працоўнага насельніцтва да вырашэньня незахопаў і зьнішчэньня іх. Асаблівую ўвагу местачковы савет павінен зварочваць на сваячасовую, шырокую справаздачасьць савету і асобных членаў яго перад выбарчыкамі. Усе гаспадарча-культурныя пытаньні павінны шырока абгаварвацца на сходах беднаты, на жаночых сходах і нашыраных пленумах савету;

2) больш зьвярнуць увагі на павялічэньне плавых сродкаў, укладаў, а таксама лікуп пайшчыкаў за ўсіх відаў маючыхся ў мястэчку камісарацыйных таварыстваў і на лепшую пастаноўку працы апошніх, асабліва па сваячасоваму і бесперабойнаму забясьпечаньню беднаты хлебам і іншымі сельска-гаспадарчымі прадуктамі;

3) разгарнуць працу па арганізацыі прасьцейшых відаў камісарацыі (малочныя, птушыныя, гародныя, садовыя і інш. таварыствы), а таксама па ўтварэньні арцеляў па перапрапоўцы мясцовага сыру і на вырабу прадукцыі больш ходкай на мясцовым і замежных рынках (цаглянае, чарапічнае, смалакурнае, выраб саломкі і інш.);

4) зьвярнуць увагу на большае пашырэньне грамадзкай ініцыятывы навакол культурных устаноў—школ і іншых, а таксама і па ўцягненьні дзяцей беднаты ў школу;

5) местачковаму савету і Глускаму Райвыканкому Выканаўчаму Камітэту прыняць належныя меры да ўзмацненьня працы местачковага камітэту ўзаемадапамогі.

IV. Бабруйскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту і Белкустрамсаюзу, не пазьней вясны наступнага году выканаць поўнасьцю план гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на арганізацыю інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі навакол мястэчка, а зараз тэрмінова прыняць меры да палепшаньня працы саматужных арцеляў праз павялічэньне крэдыту, праз сваячасовае забясьпечаньне сырцом і арганізаваны збыт прадукцыі.

V. НК Гандлю, Белкустрамсаюзу вывучыць пытаньне аб магчымасьці пашырэньня вырабу саломкі і ў 3-мясячны тэрмін далажыць Эканамічнай Нарадзе.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.
Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.
14 лістапада 1928 году, г. Менск.

ГОД ПРАЦЫ КАС АШЧАДНАСЬЦІ.
Выкананьне кантрольных лічбаў на 1927-28 г.

Развіцьцё ашчаднай справы, павялічэньне ролі ашчадных кас у сыстэме дзярж. крэдыту знайшлі свой адбітак у тых кантрольных заданьнях, якія ўрадам БССР былі ўкладзены на ашчадныя касы ў 1927-28 годзе.

Згодна устаноўленых для БССР кантрольных лічбаў, на 1-X 28 г. павінна было быць учэтэрта ў ашчадныя касы БССР 121.560 укладчыкаў з укладам у суме 8.370 тыс. руб.

У выніку працы ашчадных кас за 1927-28 апэрац. год лік укладчыкаў на 1-X г. г. дасягае 110.635, а сума ўкладаў—6.611.600 рублёў, у тым ліку па касах Зах. чыгункі колькасьць укладчыкаў на I-X складае 4.905, а астатак укладаў—376.200 руб.

Такім чынам, па БССР выкананьне кантрольных лічбаў складае: у адносіне ўкладчыкаў—86 проц. і у адносіне ўкладаў—74 проц., а з прылічэньнем процантаў у адносіне ўкладаў выкананьне заданьня дасягае 83 проц.

Рост ашчаднай справы за апошнія гады характарызуецца наступнымі данымі: на I-X 26 г. укладчыкаў было 30.650, укладаў—1.828.000 руб.; на I-X 27 г. укладчыкаў—56.018, укладаў—3.557.470 руб., а на I-X 28 г. укладчыкаў — 110.635, укладаў — 6.611.600 руб.

Прыведзеныя лічбы сьведчаць, што ў БССР па працягу апошніх гадоў мы маем значны рост ашчаднай справы. Але тыя выгады, якія мы маем, зьяўляюцца недастатковымі. Вось чаму тэмп працы ашчадных кас у 1928-29 год е павінен быць больш шпаркім в тым, каб пакрыць недавыкананьне заданьня ў 1927-28 годзе (у адносіне ўкладчыкаў—на 14 проц, і ўкладаў—на 17 проц.) і выканаць кантрольныя лічбы, якія ўстаноўлены для БССР на 1928-29 год, згодна якіх на 1-X 1929 г. павінна быць учэтэрта ў ашчадныя касы БССР 203.000 укладчыкаў і 11 мільёнаў руб. укладаў.

Такім чынам, на працягу 1928-29 году павінна быць учэтэрта новых укладчыкаў 92.365, укладаў — 4.388.400 руб.

Гаворачы аб ахопе асобных сацыяльных груп, трэба адзначыць вельмі слабы ахоп сялянства. Укладчыкаў-сялян на I-X 28 г. усяго 19.491, што ў адносіне да ліку сялянскіх гаспадарак у БССР складае толькі 2,4 проц. Сялянскіх укладаў на 1 сялянскую гаспадарку ў сярэднім прыпадае 51,1 кап.

Гэтыя лічбы паказваюць, што сярод сялянства павінна быць праведзена вялікая праца па ўцягненьню іх у ашчадныя касы.

Лік рабочых і служачых, уцягнутых у ашчадныя касы БССР, на I-X 28 г. складае 54.202, што ў адносіне да агульнага ліку сяброў прафсаюзаў дае 23,5 проц.

На I-X 27 г. на групе рабочых і служачых было ахоплена 15,6 проц.

Такім чынам, па паказанай групе маецца поўны рост, які, аднак, не зьяўляецца яшчэ дастатковым.

Падольскі.

БЕДНАТА ПОЙДЗЕ З КАМПАРТЫЯЙ.

(На канфэрэнцыі груп беднаты Менскай акр.).

Аб чым гаварылі дэлегаты канфэрэнцыі.

Тав. Пінхасік застанаўліваецца на некаторых момантах у жыцьці Дукорскага сельсавету. Летам у нас быў вялікі пажар. Пастанавіў акрвыканком правесьці земляўпарадкаваньне, але кулакам яно не падабаецца і яны падштурхівалі некаторых беднякоў ісьці супроць земляўпарадкаваньня. Бачаць кулакі, што нічога ў іх ня выходзіць, дык пачалі дзейнічаць праз жанчын. Адным чынам кулакі прымалі ўсе меры, каб земляўпарадкаваньня ня было, але бедната ўсё-ж кулакоў перамагла.

— Праводзілі мы самаабкладаньне, кажа т. Пінхасік, дык кулакі таксама рабілі перашкоды.

Наша бедната павінна актыўна дапамагчы партыі і ўладзе правесьці з посьпехам перавыбарчую кампанію. Мы не павінны пусьціць у саветы варожыя нам элементы. Сёлета ў нас партыйная ячэйка працуе добра і мы спадзяёмся правесьці ў савет таго, хто нам патрабен.

Салянка Муха з Гомельскага сельсавету скардзіцца на тое, што іх сельсавет ня прыцягвае да працы беднату.

Земляўпарадкаваньне ў нас спынілася, бо вінаваты кулакі. Яны гаворяць: як захочам, так і зробім.

Мала зьбіраць сходы беднаты, трэба ёй дапамагаць практычна. Нашы беднякі арганізавалі 3 мэліярацыйныя таварыствы. Паказаўся раз тэхнік і больш яго ня бачылі.

Кулакі, кажа т. Муха, вядуць сваю агітацыю—«ну што, кажуць, дала вам савецкая ўлада,—хлеба няма, мануфактуры няма". Некаторыя партыйцы на мясцох хныкаюць і шкадуюць кулакоў.

Нам няма чаго і шкадаваць, а трэба весьці рашучую барацьбу.

— Бедняку часта прыходзіцца ісьці да кулака за лесаматар'ялам, бо лясы мясцовага значэньня чаму-сь папалі ў рукі заможных. Млынары—тыя-ж самыя кулакі, яны абманваюць дзяржаву і беднату: — на памольны збор не даюць квіткоў, а яго кладуць сабе ў кішэні.

— Кулакі ўсюды лезуць і ім неяк шанцуе,—кажа дэлегат Гурыловіч. У Грацкім райпне бедната на лесараспрацоўкі ідзе не ў лясьніцтва, а да мясцовых заможнікаў і гэта ў нас цягнецца ўжо 5 год. Пісалі ў газэту, але нешта не дапамагае. Бедната ўсё-ж вырашала весьці барацьбу з кулакамі да канца.

— Кепска на мясцох справа з каапэраваньнем беднаты. Прыходзіць бядняк за скуртаварам, а яму кажуць, што толькі даюць за хлеб і таму тавары пападаюць у рукі заможных, —гаворыць Барысевіч з Койданаўскага райёну.

У нас на мясцох ідзе таксама драбленьне гаспадарак. Робіцца гэта прыватным чынам, а сельсавет не зварачвае на гэта ўвагі.

Трэба нам усім ісьці ў калектыўныя гаспадаркі; толькі тады мы дабʼёмся лепшага жыцьця,—заклікае канфэрэнцыю т. Барысевіч.

Агульны голас дэлегатаў—трэба беднаце лепш арганізавацца і пад кіраўніцтвам кампартыі весьці барацьбу з кулакамі і «быўшымі» людзьмі. Дзе бедната добра арганізавана, там мы маем добрыя посьпехі ў самаабкладаньні і наогул ва ўсёй савецкай працы.

— Мы ў кампанію перавыбараў саветаў пойдзем рука аб руку з камуністычнай партыяй,— заканчвае сваю прамову адзін з дэлегатаў канфэрэнцыі.

ХРОНІКА.

Барацьба за эканомію.

У сучасны момант у ВСНГБ працуе каштарысная камісія, якая зацьверджае каштарысы трэстаў і гаспадарчых адзінак на 1928-29 год.

Праца камісіі—сапраўдная барацьба за эканомію.

На якія хітрыкі і вылумкі ў каштарыснай справе ня кідаюцца трэсты пры складаньні каштарысаў? Некаторыя, каб «вырваць» тысячу—другую рублёў на «дробныя" выдаткі, выкарыстоўваюць усе сродкі, якія можна і якіх нельга выкарыстоўваць.

Адміністрацыйна-ўпраўленчыя выдаткі—важная справа. З часу абвяшчэньня эканоміі на гэтыя выдаткі, дзяржава зьберагла шмат мілёнаў рублёў. Аднак, да гэтага часу кіраўнікі трэстаў ня могуць адмовіцца ад сваіх традыцыйных тэндэцый — «не стесняться в средствах".

Вось трэст харчовай прамысловасьці. На 1927-28 год па каштарысу яму зацьверджана на гэтыя выдаткі—97.618 руб. Фактычны-ж выдатак «по ориентировочным данным" вызначаецца ў 102.103 руб. Не вядома, якія будуць „фактические данные", але ўжо на «ориентировочных» трэст мае 5.000 руб. перавышэньня.

На 1928-29 год гэты-ж трэст ня толькі ня зьнізіў сваіх выдаткаў, як гэтага патрабуюць дырэктывы органаў улады, а наадварот, прадстаўляе каштарыс на 131.959 руб. (з перавышэньнем на 35 проц.). Вось па якіх артыкулах ідзе павышэньне: на ўтрыманьне памяшканьня кіраўніцтва трэсту 12.000 руб.; камандыроўкі, у параўнаньні з леташнім годам, павялічаюцца на 1.000 руб.; паштовыя выдаткі —на 800 руб.; канцылярскія з 2.200 павялічаюцца да 4.000 руб. і інш.

Эканом-камісія трэсту, якая павінна сачыць за ажыцьцяўленьнем дырэктыў аб эканоміі, згаджаецца з прапановамі адміністрацыі ў справе павялічэньня выдаткаў.

Каштарысная камісія, зрэзаўшы каштарыс харчовага трэсту на 26 000 руб., зрабіла, бязумоўна, правільна. Але пара і трэстам быць самастойнымі ў справе вызначэньня выдаткаў. Пара не раздуваць іх да сьмешных разьмераў.

Удзел культасьветных працаўнікоў у перавыбарах саветаў.

Наркамасьветы БССР запрапанаваў усім акруговым і райённым інспэктарам нарасьветы прыцягнуць культурна-асьветных працаўнікоў да актыўнага ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі.

У прыватнасьці запрапанавана прыняць удзел у працы на аднаменьшую шырокіх працоўных мас з аспоўнымі задачамі чарговых перавыбараў, з інструкцыяй аб выбарах у сьветы, з працай па арганізацыі беднаты і г. д.

Апрача гэтага, запрачаноана дабіцца, каб на выбарчых сходах былі настаўлены самастойныя даклады, альбо даклады да справаздачных дакладаў саветаў і выканкомаў аб дзейнасьці органаў нарасьветы і культурна-асьветных устаноў.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ БЕЛАПП'а.

Сёньня, а 10 гадзіне раніцы у вялікай залі клюбу К. Маркса зробіць даклад адказны сэкратар Воапп'а тав. Сутырын аб творчых шляхох пралетарскай літаратуры.

Вячорнае пасяджэньне будзе прысьвечана пасягодьдзю Маладняка.

Уваход па запрашальных білетах.

Запрашэньне на 1-шы ўсесаюзны зьезд па рэфлексолёгіі чалавека.

Псыхатэхнічная лябараторыя Інстытуту Аховы Працы Нар. Ком. Працы БССР запрошана на 1-ы ўсесаюзны зьезд па рэфлексолёгіі чалавека.

На гэты зьезд на персональнаму запрашэньню выедзе асыстэнт псыхатэхнічнай лябараторыі інстытуту тав. Гайвароўскі.

Зьезд адчыняецца 27-га сьнежня ў Ленінградзе.

Выезд групы перасяленцаў у Біра-Біджан.

Сёньня, 28-га лістапада, выяжджае ў Біра-Біджан група яўрэйскіх перасяленцаў, у ліку 21 чал.

З гэтай колькасьці выяжджаюць. 13 чал. з Менску і 8 чал. з Барысаву.

На першы час перасяленцы будуць працаваць на лесараспрацоўках.

Падрыхтоўка кіраўнікоў для гурткоў вайсковых ведаў на вёсцы.

У мэтах стварэньня кадру кіраўнікоў гурткоў вайсковых ведаў на вёсцы, Менскі акрсавет ТДА-Авіяхіму арганізуе курсы на падрыхтоўцы кіраўнікоў гурткоў. Курсы будуць укамплектаваны з асоб маладшага начскладу запасу.

На гэты курсы будуць выдзяляцца таварыші з райсаветаў ТДА-Авіяхіму.

Гэткія курсы будуць арганізаваны ў Менску, Чэрвені і Барысаве.

Навіны Белдзяржкіно.

— Да 10-гідзьдзя абгалашэньня БССР Белдзяржкіно выпускае юбілейны кінофільм «Песьня вясны».

Зараз ужо закончаны навільённыя здымкі для гэтага кіно-фільму і ў сярэдзіне сьнежня адбудзецца грамадзкі прагляд, пасьля чаго юбілейны кіно-фільм будзе дэманстравацца ва ўсіх кіно-тэатрах гарадоў БССР.

— Закончан працай і хутка зьявіцца на Менскім экране камадыйны фільм «Пеўні пераклікаюцца».

— Закончана праца і на дняк здасца ў пракат куль-фільм «Калгас».

Гэты кіно-фільм прысьвечаны пытаньням калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

— Мантаж фільму „Агні Кітаю" ўжо закончаны і на наступным тыдні фільм будзе дэманстравацца ў Маскве, у Вялікім тэатры на сходзе, прысьвечаным гадавіне кантонскіх і шанхайскіх падзеяў.

Пасьля гэтага карціна будзе прыслана на грамадзкі прагляд у Менск.

СУД.
ЗА ЗРЫЎ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ.

З восені 1927 году ў вёсцы Навасельле, Чэрвенскага райёну, расчалося земляўпарадкаваньне. Каморнікі Ермалаеў і Станкевіч пачалі абмяжаць вашыю вёскі Навасельле.

Арганізованая бедната спачуваюча спачкала земляўпарадкавацелю, высылала дапамогу каморнікам, а заможная частка сялян, пад кіраўніцтвам кулакоў, коса паглядзела на гэтыя „новасьці".

Калі падрыхтоўка каморнікаў была скончана,—праект земляўпарадкаваньня быў перанесен на агульнае абгаварэньне сходу сялян. На сход зьявіліся заможнікі і пачалі агітаваць беднату, што дабрабыту ад земляўпарадкаваньня вёска не дасягне, што карысьці ад земляўпарадкаваньня ня будзе і г. д. Як ні дамагаліся заможнікі сарвацьпрацу на земляўпарадкаваньню, згадзіваць складзены каморнікамі праект, але бедната дала рашучы адпор заможнікам.

Складзены праект быў цалкам зацьверджаны. Але заможнікі абскардзілі праект. На першую зімы справа вандравала па судовых зямельных установах, але ўсё-ж скарга заможнікаў пакінута бяз вынікаў.

Вясной 1928 году зноў прыехалі каморнікі для вызначэньня праекту і канчатковага правядзеньня земляўпарадкаваньня. Вось тады заможнікі пачалі ўсялякімі спосабамі перашкаджаць працы, пагражалі беднаце расправай, падпалам і інш.

Мікола Ладуцька, падбухтораны заможнікамі, збіў ўнуўпаважанага на земляўпарадкаваньню Васіля Ладуцьку. Адным словам, заможнікі—Бялевіч Тадор, Ладуцька Тадор і іншыя дамагаліся сарваць работу, сьпыніць карысную справу беднаты і захаваць праклятую трохполёўку.

Хутка ў справу ўмяшалася сьледчая ўлада і заможнікі адданы суду.

Менскі акруговы суд, разгледзіўшы справу і прыняўшы пад увагу пізкі культурны ўзровень падсудных, пругаварыў:

Міколу Праколава Ладуцьку на шасьць месяцаў зьвяволеньня; Тадора Бялевіча на 4 месяцы прымусовых работ, Тадора Ладуцьку і Пётру Ладуцьку па 2 месяцы прымусовых работ і Сяргея Ладуцьку на два тыдні прымусовых работ.

Андрэй і Кузьма Дзянісовічы на суду апраўданы.

К.

Рэалізацыя білетаў 3-й усесаюзнай авіялётарэі.

У сьнежні месяцы па БССР пачнецца рэалізацыя білетаў 3-й усесаюзнай авіяцыйнай лётарэі.

Для Менскай акругі выдзелена 18000 лётарэйных білетаў.

Кошт білету—50 кап.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Паход на Вашынгтон" А. Іркутаў. Стар. 85, цана 45 кап.
2. «Шіт Дайб Ун Лэбн» Ізі Харык. Стар. 79, цана 80 кап. (На яўрэйскай мове).
3. «Статистическое обозрение» № 9. Стар. 158, цана 1 руб. 75 кап. Выданьне ЦСУ Саюзу ССР. Масква.

Апавяшчэньне.
ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня, 28-XI, а 7 гадз. ўвечары адбудзецца сход сэкцыі па галавому выхаваньню. Усіх настаўнікаў сэкцыі і школьным дактарам зьявіцца абавязкова.

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Шчырае прывітаньне IV усесаюзнай рабселькораўскай нарадзе.

Учора ўвечары ў Маскве пачала сваю працу ўсесаюзная нарада рабочых, сялянскіх, вайсковых і юнацкіх карэспандэнтаў.

Лепшыя прадстаўнікі рабселькораўскай арміі, якія зьехаліся з усіх абшараў Савецкага Саюзу, падагулялі вопыт сваёй шматгадовай працы і вырашаць шэраг практычных пытаньняў.

Рабселькораўскі рух, які ўзмацняецца ў нас з кожным годам, з разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва набывае ўсё большае значэньне ва ўсіх галінах нашага жыцьця. Гэты рух ужо мае за сабою гісторыю і ўзорныя прыклады таго, як трэба змагацца на ўсіх вучастках клясавае барацьбы.

Цяпер, калі праводзіцца лёзунг нашай партыі «па разгортваньню самакрытыкі", клясавая барацьба прымае абостраныя формы, наш друк, а з і рабкор у горадзе і селькор на вёсцы павінен яшчэ больш цесна згуртавацца навакол нашай партыі і ўлады рабоча-сялянскія масы, якія больш актыўна паводзяць рашучую барацьбу з усімі недахопамі.

Новыя кадры павінны папоўніць шэрагі рабселькораўскай арміі.

IV рабселькораўская нарада дасьць новы штурмок, калектыўны вопыт, ясны напрамак для працы ўсіх рабселькораўскіх арганізацый.

Пажадаем пасьпяховай працы гэтай нарадзе!

ЦІ НЯ ТРЭБА „КРЫТЫКАМ" ДУЛЬЦЫНЫМ ПАКАЗАЦЬ ІНШАЕ МЕЙСЦА.

Служачыя чэрвеньскай больніцы нарыдычна выпускаюць насьценную газэту. Пішуць у ёй аб усім і, вядомая рэч, аб якіх-небудзь недахопах, калі яны датычацца тэхнічнага пэрсаналу. Але што мае дачыненьне да адміністрацыі, дык наконт гэтага рэдкалегія нічога не зьмяшчае. Такія вінеткі тэрмінова накіроўваюцца ў сьмяцьцёвую скрынку з сардэтым выкрыкам: «Каго, нас уздумалі крытыкаваць? Вот вам!». Пры апошніх словах заметка разьлятаецца на кусочкі.

Чаму ж гэта так робіцца?

А таму, што ў гэтай рэдкалегіі зьяўляюцца членамі доктар Шапіра і Дульцын, якія аберагаюць аўтарытэт сваёй карпарацыі.

Тэхнічны пэрсанал супроць гэтага вельмі абуран. Некаторыя з іх думаюць жаліцца, але баяцца, бо Шапіра і Дульцын главары і пасьля гэтага не здабраваць.

Такім чынам гэта газэта мае вось які зьмест: крытыка тэхнічак і хвалебныя перадавіцы адміністрацыі.

Вось якія ў нас праваднікі самакрытыкі. Трэба, мусіць, некаму ў гэту справу ўмяшацца.

Цяпер некалькі слоў пра гэтых самых рэдактароў.

6 лістапада, калі ў клюбе праходзіла ўрачыстае пасьджэньне гарсавету, прысьвечанае дню Кастрычніка, рэвалюцыі, дык больнічная адміністрацыя ўстроіла сваё пасьджэньне ў доктара Нісьневіча, дзе замест духавога аркестру іграла скрыпка і зьвінелі шклянкі. Што ім рэвалюцыя, што ім нейкія даклады?

Нісьневіч і да рэвалюцыі быў доктарам, Кудзін быў гарадзкім галавом. Нягай яны засядаюць сабе на старой кружбе, але там-жа быў і доктар Дульцын, які скончыў навуковую установу дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі. Чаму гэта так здарылася? М.

Шырэй разгарніце працу з селькорамі!

У м. Смалявічы ў нарадоме 18-га лістапада адбылася нарада селькораў, на якую зьявілася 39 селькораў з усіх куткоў райёну. На нарадзе былі разабраны пытаньні: 1) аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў і ўдзеле селькораў, а таксама аб агляде працы груп беднаты і 2) выніку агляду працы пасьцелгазэт.

Па першаму пытаньню шырока разгарнуліся спрэчкі. Селькоры казалі: „Дрэнна, што ў шмудыя перавыбары правялі ў склад сельсаветаў кулакі па Клінцкаму, Жодзінскаму, Варатоўскаму сельсаветах. Ёсьць выпадак у Жодзінскім сельсавеце, калі кулак—член сельсавету Раманоўскі, даў заможніку даведку, што ён бядняк, а калі сапраўды бядняк папрасіў у гэтага самага Раманоўскага даведку, дык ён на даў яму".

Таксама нарада адзначала на дрэнную працу сельсаветаў сярод беднаты. Групы беднаты ў большасьці працуюць кепска: сходы беднаты праводзяцца тады, калі трэба праводзіць якую-небудзь кампанію, і то пытаньні прапрацоўваюцца з спазьненьнем.

Праца камісій пры сельсавеце амаль зусім адсутнічае. Ёсьць на райёну пры сельсаветах такія камісіі, якія нават не рабілі арганізацыйных пасяджэньняў. Кіраўніцтва працай камісій з боку РВК таксама няма. Членамі сельсавету складаліся акты аб патравах, а сельсавет ніякіх мер ня прымаў (Юраўскі).

Селькоры скардзяцца на тое, што слаба разгорнута самакрытыка ў вёсцы.

Насьцелгазэты ў большасьці сваёй выпускаюцца нерэгулярна. Бываюць выпадкі, калі газэты выпускаюцца пры ўдзеле 3—4 чалавек, насельніцтва мала прыцягваецца да ўдзелу ў выпуску газэты, нагадваецца шмат палітычных трэскатні і газэты ў большасьці зьяўляюцца кампанейскімі.

Рэдкалегіі ў значным ліку абіраліся партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі.

Вучэт селькораў як у райвыканкоме, так і ў райкоме партыі амаль адсутнічае і праца з селькорамі праводзіцца дрэнна.

Справа ўсіх арганізацый — дапамагчы селькорам у іх працы, якія імкнуцца выправіць недахопы нашага будаўніцтва.

Партыйным і камсамольскім ячэйкам на мясцох, а таксама і хатан-чытальням абавязкова будзе разгарнуць працу з селькорамі.

Б. Маркевіч.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

Няма печы.

Памяшканьне Жодзінскага сельсавету (Менчына) апальваецца чыгуначнай печчу, якая ўжо сапсавана. У выніку і дроў трацяць шмат, і холадна, і дымна, і няма як працаваць.

Трэба каб РВК адпусьціў сродкі на пабудову печы.

Б. Дзяруга.

Трэба пацікавіцца.

Чаму гэта загадчык базы Халопеніцкага спажывецкага таварыства Шапіра шматчачную муку выдае толькі свалкам, а не на картках і пасьведчаньнях урача? Л.

Забараніце ашуканства сялян.

Вельмі многа пажываецца ад сялян вакольных вёсак селянін вёскі Сянічава Цілінцкага с.-савету Балуневіч, які займаецца тайным гандлем жывёлы. Балуневіч досыць вёрткі чалавек і ашукае сялян на кожным кроку.

Трэба каб кааператыў і фінчастка РВК зьвярнулі на гэта ўвагу. Васілёк.

Моцна сьпіць

Ніэф над вёскай Сёмкавы-Гарадок (Менчына). Саюз харчавікоў вінных выездаў і ніякай працы ў падшэфнай вёсцы не праводзіць. Б. Б.

Кепска працаваць.

Народны суд 12-га вучастку гор. Слуцку ня мае належнага памяшканьня. Для пасьведчальнікаў няма асобнага пакою. У выніку згульная канцылярыя заўсёды запоўнена людзьмі якія перашкаджаюць працаваць. Зьведак пасьля паказальняў прымушаюцца сьвоцішь у халодны калідор.

Нарэшце ужо некалькі раз зварочваўся ў гарсавет з просьбай, каб далі лепшае памяшканьне. Аб гэтым гаварылася і на выбарчых сходах нарэзасядацеляў, але пакуль што нічога няма.

Мышанін.

Вылучэньне.

Барысаўскі гарсавет вылучыў на пасаду памоцніка начальніка райённай міліцыі рабочага фабрыкі «Роза Люксембург» т. Дурманава.

Рабочы фабрыкі «Прафінтэрн» назначае загадчыкам барысаўскай Біржы Працы.

Рабкор.

Самі пастараліся, а на вёску не зьвярнулі ўвагі.

Добра прайшла падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на гор. Барысаву: замест вызначаных па заданьню 165000 рублёў сабрана падпіска на 277000 р.

Але затое падпіска дрэнна прайшла на вёсках Барысаўскага райёну, дзе сабрана падпіскі ўсяго на 515 рублёў. Рабкор.

Папраўка.

У № 272 нашай газэты (за 27 лістапада г. г.) на 4-й старонцы ўкрадся недахопасьць. Надрукавана — „2-гі ўсебеларускі зьезд „Маладняка", а павінна быць—„1-ы зьезд Беларускай асацыацыі пралетарскіх пісьменьнікаў".

Паштовая скрынка.

Калямойцу. Калі ня плоціце страхуваньня, трэба ўжыць адміністрацыйныя меры, а ня пісаць заяву ў рэдакцыю.

Ліўшыцу. (Халопеніч). „Хто вінаваты ня пойдзе; „Навошта гэта"—накіравана ў Белсельтрэст.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Серада, 28 лістапада
Пралетстуду МЯЦЕЖ рэвал. п'еса ў 7 абразох.
Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.
Пасьля 3-га сыгналу ўваход у відоўню зачынен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 1) „ДОМ НА ТРУБНОЙ" у 6-ці частках і замежная камэдыя 2) „КАХАНЬНЕ І СПОРТ" у 5-ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 45 хв.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". 3 аўторка, 27 лістапада Пат і Паташон у новай камэдыі „ВЫДАТНЫЯ ПАДАРОЖНІКІ" ў 7 частках. 3 сэансы: пач. 1-га ў 7 г.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Трука-прыгодніцкі кіно-раман у 2-х сэрыях і 4 эпізодах 2 сэрыі 14 частак у адзін сэанс сэрыі 2 „Паміж жыцьцём і сьмерцю".

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». „НЯМЫ ДРУГ" драма ў 6 ч. Зьвыш праграмы кіно-хроніка «Совкино». Пачатак сэансаў а 3 з пал. гадз. удзень.

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ СВАЕЧАСОВА ПАДПІСАЦЦА НА ГАЗЭТУ „Савецкая Беларусь" на 1929 год.

Да ведама падпісчыкаў „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".
Пры неатрыманьні сваечасова газэты, трэба даведацца ў сваім паштовым аддзяленьні, ці ёсьць там КАРТКА на імя падпісчыка. Калі ёсьць, патрабаваць газэту там, калі няма, зрабіць запытаньне ў кантору, паведаміўшы, куды здадзена падпіска, на які тэрмін, нумар квітка і свой дакладны адрас. Бяз гэтых вестак скаргі разглядацца ня будуць.

ЯКУБ КОЛАС ТОМ I ВЫПУСК ДРУГІ
БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ЗГУБЛЕНЫ.

— Літэр на бесплатны праезд у Воршу Коськіна В. І. кв. 211.
— Прыняская кніжка за № 295 Ігнатовіча В. Х. нараджэньня 1907 г., кв. 211.
— Асабовая кніжка Пулькіна І. П., выд. быўш. Бобрскім РВК, кв. 211.
— Сяброўскі білет № 217 Міркіна С. Г., выд. Крупскім спаж. т-вам, кв. 211.
— Партбілет № 1102022 Ліньвінава Н. П., выд. Барысаўскім акружкомам КПБ, кв. 211.
— Сяброўская кніжка № 31262 Жыгіроўскай О. Б., выд. Менскім саюзам працаўсьветы, кв. 212.
— Справка аб праны Рульковіча С. А., выд. Менскім камгасам, кв. 213.
— Залікова кніжка Талкачэвіча А. Г., выд. Белар. с.-гасп. акадэм. у Горках, кв. 214.
— Партбілет № 0485607 Дабулевіча А. А., выд. Астроўскім укомам Пскоўск. губ., кв. 215.
— Кааперац. кніжка № 592 Бушэвіча В., выд. Астрам.-Гарадзецк. спаж. т-вам кв. 219.
— Пасьведчаньне аб дабрахвотніцкай службы ў Чырвон. [illegible] за № 7, выд. Штабам [illegible] № й Чэнгарскай № дывізіі на імя [illegible] в. № 20[illegible].
— Біржавы талён Барысава Н. А., выд. Біржай Працы, кв. 157.
— Кооперац. кніжка за № 16342 Шагалавай Б. М., выд. МЦРК, кв. 158.
— Пасьведчаньне на права ўладаньня нарухомай маемасьцю па Лаўска-Наборажнай вул